

# «НАМ ТРЭБА ПАШЫРАЦЬ ПА НАМЕНКЛАТУРЫ НАША СУПРАЦОЎНІЦТВА»

**Чым яшчэ могуць быць карысныя адна адной Беларусь і Цюменская вобласць, гаварылі ў Палацы Незалежнасці**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
29 ліпеня 2025 г. АЎТОРАК № 143 (30531)



Нягледзячы на складаныя кліматычныя ўмовы, жніво набірае тэмпы. У Беларусі ўжо ўбралі **19 %** плошчаў збожжавых і зернебабовых культур (без уліку кукурузы, грэчкі і проса), што складае **378 тыс. га**. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Мінсельгасхарча.

Па аператыўных звестках на 28 ліпеня, са збожжавых палеткаў краіны намалочана **1 млн 612 тыс. т** збожжа. Сярэдняя ўраджайнасць вышэйшая за папярэдні год на **8,8 ц/га**.

Па валавым намалоце ў лідарах Брэсцкая і Гродзенская вобласці — адпаведна **453 тыс. т** і **402 тыс. т**. На Міншчыне сабрана **372 тыс. т**, Гомельшчыне — **185 тыс. т**, Магілёўшчыне — **131 тыс. т**, Віцебшчыне — **69 тыс. т.**

Азімы ячмень убраны на **93 %** плошчаў. Намалочана **903 тыс. т** з ураджайнасцю **39,8 ц/га**, што таксама вышэй за леташні паказчык на **7,5 ц/га**. Азімы рапс на зерне ўбраны на **135 тыс. га** (**36 %** усёй плошчы), з якіх намалочана **284,5 тыс. т.**

Выцераблена лёну на **15 тыс. га**, што складае **31 %** запланаваных плошчаў. Скошана траў другога ўкосу на плошчы **760 тыс. га** (**71 %** плана). Нарыхтавана сена больш за **273 тыс. т** (**38 %** плана), сенажу — **10 млн 657 тыс. т** (**76 %** плана), у тым ліку ў палімернай упакоўцы **289** тыс. т.

# ЖНІВО НАБІРАЕ АБАРОТЫ

СТАР. 4–5

Фота БелТА.



ЯК НЕ ТРАПІЦЬ НА ВУДУ КІБЕРЗЛАЧЫНЦАЎ?

11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ВІТРАЖЫ МАЙСТЭРСТВА

## ВЫБАР МАЛАДЫХ

**Уступная кампанія ў каледжы праходзіць пад знакам кадравага прарыву для ключавых сфер эканомікі**

У апошнія гады каледжы актыўна развіваюць свае праграмы і прапаноўваюць новыя спецыяльнасці, запатрабаваныя на рынку працы. Сярод іх ёсць як традыцыйныя кірункі, так і інавацыйныя, звязаныя з новымі тэхналогіямі і галінамі.

Абітурыенты могуць выбраць спецыяльнасць у галіне інфармацыйных тэхналогій, інжынерыі, медыцыны, эканомікі, права і многіх іншых.

Каледжы прапануюць не толькі тэорыю, але і практычную падрыхтоўку, дзякуючы чаму выпускнікі гатовы да працы адразу пасля заканчэння вучобы.

СТАР. 8–9



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ISSN 1990 — 763X
25143



# «НАМ ТРЭБА ПА НАМЕНКЛАТУРЫ

## Чым яшчэ могуць быць карысныя адна адной Беларусь

Чарговы рабочы тыдзень кіраўніка дзяржавы пачынаецца сустрэчай з сябрамі і планамі на будучыню. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прымаў у Палацы Незалежнасці дэлегацыю Цюменскай вобласці на чале з губернатарам Аляксандрам Маорам.



Найперш беларускі лідар перадаў прывітанне паслу Расіі ў Беларусі Барысу Грызлову ад Уладзіміра Пуціна. Аляксандр Лукашэнка напярэдадні правёў тэлефонную размову са сваім расійскім калегам. «Я яму кажу, што з цюменцамі сустракаюся. «Гэта багатая вобласць, з імі трэба размаўляць», — перадаў жарт расійскага лідара Прэзідэнт.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, гэты расійскі рэгіён вельмі блізкі беларусам. Ён расказаў, што яшчэ ў савецкія часы бываў у Лангепасе, які тады з'яўляўся пасёлкам. «Яго спраектавалі, пабудавалі беларусы. І тады спецыялісты і кіраўніцтва вобласці былі вельмі задаволеныя іх працай», — нагадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адну нітачку, якая звязвае Беларусь і Цюменскую вобласць, у прыватнасці кіраўніка рэгіёна. Прадзед Аляксандра Маора падчас Вялікай Айчыннай вайны загінуў пад Віцебскам і там жа, у Лёзне, пахаваны. «Мы трапятліва ставімся да герояў той вайны. І нас пераконваць у гэтым не трэба. Пахаванні савецкіх байцоў і ўсіх загінулых у Беларусі, нашых людзей, мы свята шануем. Устаноўлены сотні мемарыялаў, помнікаў у нашай краіне ў гонар гэтых людзей, якія прынеслі нам Перамогу», — адзначыў Прэзідэнт.

### «ВЫ БУДЗЕЦЕ Ў ГЭТЫМ ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ»

Аднак галоўнай тэмай размовы стала не агульнае мінулае, а сённяшняе супрацоўніцтва для задзелу на будучыню.

**Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што цяпер тавараабарот паміж Беларуссю і Цюменскай вобласцю складае каля чатырох мільярдаў долараў. «Ды ёсць адно «але» ў нашым супрацоўніцтве. Мы ў вас у асноўным купляем вуглевадародную сыравіну. Гэта добра. Дзякуй за тое, што робіце ўсё, каб забяспечыць сыравінай гэтай беларускія прадпрыемствы. Нам хацелася б, каб мы ў вас куплялі вялікую наменклатуру. Вы ў гэтым будзеце, вядома ж, зацікаўленыя. Гэта значыць, нам трэба пашыраць па наменклатуры наша**









У ТЭМУ

**Юрый ШУЛЕЙКА:**

## «ДВУХБАКОВАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎПЭЎНЕНА РАЗВІВАЕЦЦА»

### Намеснік Прэм'ер-міністра Юрый Шулейка правёў сустрэчу з губернатарам Цюменскай вобласці Аляксандрам Маорам.

На сустрэчы з расійскім губернатарам віцэ-прэм'ер акцэнтаваў: штогадовы тавараабарот Беларусі і Цюменскай вобласці імкнецца да 4 мільярдаў долараў.

— Асноўная частка тавараабароту — гэта важная для Беларусі вуглевадародная сыравіна, якая закупляецца ў Цюменскай вобласці. Імпарт такіх тавараў дазваляе нашай эканоміцы нармальна функцыянаваць, а беларускім прадпрыемствам выпускаць прадукцыю як для ўнутранага рынку, так і экспарту, — адзначыў ён.

Па словах Юрыя Шулейкі, паступальна развіваецца супрацоўніцтва ў галіне паставак беларускіх ліфтаў, сельскагаспадарчай тэхнікі, у тым ліку ў рамках абласных праграм.

— Удзячныя цюменскаму кіраўніцтву за распаўсюджанне на беларускую сельскагаспадарчую тэхніку механізму субсідзіравання закупкі такой прадукцыі аграрыямі, — падкрэсліў ён.

Юрый Шулейка таксама адзначыў значны патэнцыял у пастаўках для Цюменскай вобласці дарожна-будаўнічай, грузавой, спецыяльнай і пасажырскай тэхнікі:

— У тым ліку з выкарыстаннем ільготных фінансавых інструментаў, якія даюцца Банкам развіцця Беларусі.



Фота БелТА.

Акрамя таго, як падкрэсліў профільны віцэ-прэм'ер, узаемную цікавасць для бакоў могуць уяўляць праекты па пастаўках у Цюменскую вобласць абсталявання для жывёлагадоўчых аб'ектаў, а таксама камбікармоў, прэміксаў і амінакіслот вытворчасці БНБК, ветэрынарных прэпаратаў для патрэб сельгаспрадпрыемстваў.

# ПАШЫРАЦЬ НАША СУПРАЦОЎНІЦТВА»

## і Цюменская вобласць, гаварылі ў Палацы Незалежнасці

**супрацоўніцтва», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Цюменскую вобласць пастаўляецца нямала камплектаў шасі на базе МАЗ. На гэтыя шасі ўстанаўліваецца абсталяванне для гідраразрыву пластоў для больш сучаснай здабычы нафты, пажарныя ўстаноўкі і гэтак далей. «Але неяк прытармазілі па аўтобусах. Хоць мы планавалі іх вытворчасць з абласцямі Расійскай Федэрацыі і з вашай вобласцю. Вядома, мы аўтобусы гэтыя прададзім, попыт вельмі вялікі. Але хацелася б, каб мы наша супрацоўніцтва ў гэтай сферы не зніжалі.

**Хацелася б, каб і беларускія аўтобусы былі на маршрутах у вашай вобласці, не толькі ў Цюмені. Мы можам рабіць іх і на газаматорным паліве, а электробусы — сёння шырока выкарыстоўваюцца ў Беларусі, яны прайшлі вельмі сур'ёзныя тэсціраванні. Таму, калі цікавасць у вас будзе да гэтага, паглядзіце», — прапанаваў беларускі лідар.**

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, сёння ў Цюменскай вобласці вельмі запатрабаванае абсталяванне для здабычы нафты. «Вы ведаеце, што пастаўкі гэтага абсталявання заточаны ў асноўным на Цюменскую вобласць.

**А цяпер, калі гэтыя шалёныя сышлі ад нас, ад вас (дзякуй богу, хай сыходзяць), мы гатовы замяніць іх і пастаўляць па ўсёй Расіі неабходнае абсталяванне для здабычы вуглевадароднай сыравіны. У нас ёсць нейкія навыкі», — акрэсліў яшчэ адзін кірунак супрацоўніцтва беларускі лідар.**

Прэзідэнт звярнуўся да губернатара Цюменскай вобласці з просьбай, якая вынікае з нядаўняй нарады па здабычы нафты ў Беларусі. «Ясна, што і ўрад, і «Беларуснафта», і спецыялісты нашы заточаныя на адну кампанію — «Беларуснафта», і яны дакладваюць у адным кірунку. Мне хацелася б атрымаць экспертную ацэнку спецыялістаў з нагоды перспектыў здабычы вуглевадароднай сыравіны ў Беларусі. Я неяк не магу паверыць, што, здабываючы калісьці больш за 8 мільёнаў тон у савецкія часы, мы сёння скаціліся да двух, праўда, крыху прыпадняліся. Я не веру, што ў нас няма гэтай вуглевадароднай сыравіны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.



**— Але патрэбны спецыялісты, якія мне маглі б сказаць, ёсць ці не. Хацелася б, калі гэта магчыма, пару чалавек, якія маглі б нам нешта падказаць, параіць, як нам працаваць далей. Гэта для мяне трэба, не для нашай кампаніі, яны нібыта ўсе ведаюць і разумеюць. Нам патрэбны незалежныя эксперты, якія маглі б адказаць на пытанне, у якім кірунку нам тут развівацца. Ці варта нам укладваць грошы ў новую разведку або старыя неяк свідраваць.**

Хоць мы навучыліся нямала і па гарызантальным свідраванні, з вамі дзелімся гэтымі навыкамі. Вось такая да вас просьба, калі гэта магчыма».

Прэзідэнт нагадаў, што раней беларусы куплялі ў цюменцаў шмат газатурбінных установак. Шмат закуплялі на Захадзе гэтых установак. «Але вы навучыліся пасля іх сыходу ажыццяўляць рамонт, абслугоўванне. Да гэтага наш інтарэс вялікі – акрамя вуглевадароднай сыравіны ў вашай вобласці. Мы гатовы супрацоўнічаць з вамі з нагоды турбін, асабліва замежнай вытворчасці, якія вы навучыліся рабіць», — адзначыў ён. Таксама, па словах кіраўніка дзяржавы, беларусы гатовы працаваць з цюменскімі калегамі ў сферы біябяспекі, правядзення навуковых даследаванняў у гэтым плане.

«Я думаю, вы добра ведаеце магчымасці Беларусі. Але апошнім часам мы чамусьці навучыліся. Калі вы нешта ўбачыце карыснае для Цюменскай вобласці, скажыце — мы будзем заўсёды рады задаволіць вашы запыты і патрэбы», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

### ПРЫЯРЫТЭТ — СУПРАЦОЎНІЦТВА З БЕЛАРУСКІМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ

У сваю чаргу Аляксандр Маор прызнаўся, што для яго было важна наведаць Беларусь у 80-годдзе Вялікай Перамогі. «Гэта асаблівыя эмоцыі, і сапраўды мой прадзед загінуў і пахаваны ў Віцебскай вобласці. Гэта было ў снежні 1943 года. А літаральна месяцам пазней мой дзед, яго сын, вызваляў Беларусь і Украіну, прайшоў палову Еўропы, дзякуй богу, жывым вярнуўся з вайны. Таму сапраўды ёсць асабістая сувязь», — расказаў ён.

Па словах губернатара, для Цюменскай вобласці адным з прыярытэтаў з'яўляецца развіццё адносін з прадпрыемствамі Беларусі. Аляксандр Маор звярнуў увагу, што Цюмень, Цюменская вобласць яшчэ з савецкіх і больш ранніх часоў сталі для беларусаў другім домам. Ён расказаў, што дагэтуль у іх жывуць людзі, якія размаўляюць на беларускай мове. «Беларуская зямля падарыла Цюменскай вобласці шмат таленавітых людзей. Шмат гадоў кіраўніком горада Цюмень быў Сцяпан Міхайлавіч Кірычук, які нарадзіўся ў Брэсцкай вобласці», — дадаў ён.

«Сёння мы адзначаем рост тавараабароту паміж Цюменскай вобласцю і прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь. Асноўная доля — гэта нафта і газ, прадукты нафтахіміі. І мы таксама зацікаўленыя ў тым, каб тавараабарот рос па больш шырокай наменклатуры», — адзначыў Аляксандр Маор.

### Даслоўна

У размове з журналістамі сустрэчу з беларускім лідарам **губернатар Цюменскай вобласці Аляксандр МАОР** назваў сустрэчай сяброў. Паводле яго слоў, у Цюменскую вобласць ужо шмат гадоў пастаўляецца якасная беларуская тэхніка. Яна запатрабаваная ў сельскай гаспадарцы, камунальных службах. 70 % ліфтаў, якія былі заменены ў рэгіёне, — беларускай вытворчасці. «Вельмі важныя для Цюменскай вобласці і Беларусі супрацоўніцтва ў паліўна-энергетычнай сферы, нафтагазавым машынабудаванні, аказанне сэрвісных паслуг. Ва ўмовах незаконных санкцый мы зацікаўлены ў вытворчасці новага абсталявання, не толькі ў замене і рамонце таго, што ёсць, а ў выпуску сучаснага і канкурэнтаздольнага. Таму будзем прапаноўваць нашым беларускім калегам супрацоўніцтва з нафтагазавым кластарам, у які сёння ўваходзіць амаль 200 кампаній з 26 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. А сам кластар зарэгістраваны ў Цюменскай вобласці», — дадаў губернатар.

**Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА**

АКЦЭНТЫ

## УСЕ СУР'ЁЗНЫЯ ПЫТАННІ АБМЯРКУЮЦЦА ПРЫ АСАБІСТАЙ СУСТРЭЧЫ

Аб згаданай Аляксандрам Лукашэнкам падчас сустрэчы з губернатарам Цюменскай вобласці тэлефоннай размове з Уладзімірам Пуціным расказала ТАСС прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ.

«У прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, безумоўна, заўсёды ёсць што абмеркаваць. Так бы мовіць, пул тэм — як па двухбаковых адносінах, так і па міжнародным парадку дня», — сказала яна.

Паводле інфармацыі Наталлі Эйсмант, напярэдадні праграмныя пытанні па тэлефоне лідары абмяркоўваць не сталі. «Ёсць тэмы, якія наогул па тэлефоне лепш не абмяркоўваць. Прэзідэнты дамовяцца ў найбліжэйшы час аб сустрэчы і ўсе найважнейшыя і сур'ёзныя пытанні абмяркуюць адзін на адзін».

## «ЁСЦЬ ЗАПРАШЭННІ БОЛЬШ ЗА ПАЎСВЕТУ НАВЕДАЦЬ»

Ёсць вельмі шмат запрашэнняў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку здзейсніць замежныя візіты. Пра гэта міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ расказаў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1», паведамляе БелТА.

Апошнім часам і ў самога кіраўніка беларускага знешнепалітычнага ведамства шмат замежных камандзіровак. У іх ліку — саміт БРІКС у Бразіліі, удзел у пасяджэнні Савета міністраў замежных спраў ШАС у Кітаі, візіты ў Тайланд і Лаос. Журналісты пацікавіліся, ці азначае гэта падрыхтоўку візітаў на вышэйшым узроўні.

«Ёсць пытанне прыватнасці адносін з нашымі партнёрамі. Але, паверце, запрашэнняў вельмі шмат. Гэта і краіны Афрыкі, і Лацінскай Амерыкі, і краіны Азіі. Напрыклад, апошні візіт у Лаос. І там Прэзідэнта чакаюць, — сказаў Максім Рыжанкоў. — І да нас таксама хочуць ехаць. Ёсць запрашэнні больш як паўсвету, напэўна, наведаць. Мы зыходзім з таго, дзе гэта будзе больш перспектыўна для нашых адносін».

**ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН**

**4 жніўня 2025 года** Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў.

Папярэдні запіс на асабісты прыём будзе ажыццяўляцца з 29 да 31 ліпеня з 8.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 па тэлефонах: (8-017) 222 69 25, (8-017) 222 63 58.

# УТУЛЬНАСЦЬ СВАЙГО ДОМА

## Саўмін устанавіў крытэрыі і парадак вызначэння па выніках Года добраўпарадкавання найлепшых вобласці, раёнаў, населеных пунктаў



Гэта вынікае з пастановы Савета Міністраў ад 23 ліпеня 2025 года № 403, апублікаванай на Нацыянальным інтэрнэт-партале, паведамляе БелТА.

Дакумент уносіць шэраг змяненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 лютага 2025 года № 97. Пастановай зацвярджаецца рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2025-м Года добраўпарадкавання і Палажэнне аб крытэрыях і парадку вызначэння па выніках Года добраўпарадкавання найлепшых вобласці, раёнаў, населеных пунктаў.

Крытэрыямі для вызначэння лепшай вобласці з'яўляюцца: выкананне паказчыкаў рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2025-м Года добраўпарадкавання; стварэнне аб'ектаў знешняга добраўпарадкавання населенага пункта; доля прыцягнутых грашовых сродкаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, што паступілі на рахункі арганізацый, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў для выканання работ па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні населеных пунктаў, прадастаўлення дадатковай жыллёва-камунальнай паслугі па ўладкаванні прыдамавых тэрыторый элементамі азелянення, добраўпарадкавання і іх далейшага ўтрымання, у тым ліку ў рамках рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў, у разліку на 1 тысячу жыхароў у агульным аб'ёме фінансавання мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні тэрыторый; узровень выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў.

Згодна з дакументам, крытэрыямі для вызначэння лепшых раёнаў з'яўляюцца: выкананне паказчыкаў рэгіянальных планаў мерапрыемстваў, звязаных з правядзеннем у 2025-м Года добраўпарадкавання; стварэнне аб'ектаў знешняга добраўпарадкавання населенага пункта; доля прыцягнутых сродкаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку ў рамках рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў, у разліку на 1 тысячу жыхароў у агульным аб'ёме фінансавання мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні тэрыторый; узровень выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў.

Крытэрыямі для вызначэння лепшых населеных пунктаў з'яўляюцца вынікі штогадовага рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь, які праводзіцца на ўмовах і ў парадку, устаноўленых Міністэрствам ЖКГ.

**Вызначэнне найлепшых вобласці і раёнаў па выніках Года добраўпарадкавання праводзіцца па бальнай сістэме. Найлепшымі становяцца вобласць і раён, якія набралі найбольшую колькасць балаў.**

**Пастанова ўступае ў сілу са дня яе прыняцця.**

# ЛІПЕНЬ НЕ ГУЛЯЕ,

## Як ідзе жніво ў Бярозаўскім раёне

...Камбайны на хаду, на іх ёсць каму працаваць, і як толькі дазваляе надвор'е, выходзяць у поле. Не тое, што кожны дзень — кожную сонечную гадзіну трэба скарыстаць на ўборку ўраджаю 2025-га. У такім рэжыме працуюць усе 10 гаспадарак Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, разумеючы: разлічваць трэба найперш на сябе. І робяць усё дзеля таго, каб у год, складаны з пункту гледжання надвор'я, узяць сваё па максімуме.

### ШТО «Ў ПЛЮСЕ»?

Трэба адзначыць, што жніво ў раёне сёлета пачалося крыху пазней, чым звычайна. І на дадзены момант прыбрана ўжо 30 % плошчаў збожжавых і зернебабовых культур. Азімы ячмень абмалочаны два тыдні таму — менавіта з яго пачалося жніво. У выніку ўбралі 1893 гектары, намалацілі 8200 тон, сярэдняя ўраджайнасць — 43 цэнтнеры з гектара — ужо ёсць плюс да ўзроўню мінулага года (тады было 7700 тон). Па меры выспявання падключаюць іншыя культуры, на сённяшні дзень у раёне завяршаюць уборку рапса і прыступаюць да абмалоту іншых зерневых культур.

— На ўраджайнасць рапсу істотна паўплывалі вясеннія замаразкі, — расказвае **Інэса ПАЖАРЫЦКАЯ, першы намеснік упраўлення сельскай гаспадаркі Бярозаўскага райвыканкама**. — Пры тым што перазімаваў ён няблага, пасевы былі выдатныя. У раёне ўжо ўбрана 94 % пасеваў рапсу, намалочана 9425 тон, ураджайнасць — 24,9 цэнтнера з гектара (на дадзены момант маем мінус 9,6 ц/га ў параўнанні з мінулым годам). Магчыма, што рапсу не дабяром. Аднак, згодна з дзяржзаказам, ужо здалі 496 тон рапсу з 550 (90 %), якія раён павінен паставіць. Дзяржзаказ трымаем на кантролі. У нас не бывае такога, каб не выканалі, кожны год спраўляемся з задачай дзяржзаказу па розных культурах. Уборачная ў самым разгары, але ўжо можна нешта прагназаваць. Напрыклад, яравыя культуры паказваюць ндзрэнны плюс па ўраджайнасці.

І гэта пры тым, што вясновыя замаразкі мелі наступствы. Сельгаспрадпрыемствы раёна ўсімі спосабамі стараліся пераадолець сітуацыю, рабілі ўсё магчымае, каб падтрымаць пасевы. З бюджэту — мясцовага і абласнога — выдзяляліся сродкі на закупку азотных угнаенняў. Таксама куплялі амінакіслоты для падтрымкі пасеваў, каб мінімізаваць страты ўраджаю. На сёння яравы ячмень убраны на 88 % плошчаў, ураджайнасць — 51,7 — і гэта плюс 17,7 цэнтнера з гектара ў параўнанні з пакасчыкамі мінулага года. Спецыялісты ў раёне адзначаюць, што амаль усе культуры паказваюць плюс.

— Мяркуем, што ўраджай збожжавых і зернебабовых культур будзе на ўзроўні мінулага года, а магчыма, нават з плюсам, — адзначае Інэса Сяргееўна. — Нягледзячы на тое, што дажджы паўплывалі на ўсе культуры. Асаблівая ўвага да палеглых участкаў — расліны могуць пачаць прарастаць на вільготнай глебе. Але пры неабходнасці будзем апрацоўваць гэтыя пасевы гліфасатутрымліваючымі прэпаратамі, якія закуплены і выкарыстоўваюцца для таго, каб змагацца з зелянінай. Што рабіць, гаспадаркі вымушаны весці ўборку пры высокай вільготнасці, але ў сувязі з умовамі надвор'я мы бачым, што інакш немагчыма. Сушым.

### СПРАВА ТЭХНІКІ

Усе гаспадаркі ў раёне цалкам забяспечаны зернесушыльнымі комплексамі, ёсць мабільныя перасоўныя сушылкі. Цяпер стаіць задача ўбраць рапс і ячмень, — тое, што першае падышло і можа асыпацца. Але ў гаспадарках пакрысе пачынаюць прыступаць да іншых культур, напрыклад, дзе-нідзе ўжо паспрабавалі ўбіраць жыта — падпаленыя ўчасткі, альбо пагоркі. Пры высокай вільготнасці выбарачна робяць пракосы — каб сушыла ветрам і хутчэй ішло выпарванне вільгаці. Калі нешта і стрымлівае жніво цяпер, то менавіта надвор'е.

Але хіба гэтым можна здзівіць тых, хто працуе на зямлі з году ў год і разумее, што трэба рабіць, каб пераадолець наступствы розных несприяльных умоў? Усе гаспадаркі тэхнічна падрыхтаваныя: на палях раёна працуюць 73 камбайны. На ўборцы рапсу занятыя камбайны са спецыяльнай прыстаўкай, якая дазваляе зменшыць страты

# БЕЗ ТРАЎМ

## Рызыкі ўборачнай кампаніі

У Гродзенскай вобласці абмеркавалі ахову працы і вытворчую дысцыпліну на ўборачнай кампаніі. Абмеркаванне адбылося ў рамках абласнога семінара-нарады, які прайшоў у Навагрудскім раёне. Базай для правядзення семінара-нарады стала гаспадарка «Нягневічы», адна з перадавых у рэгіёне.



Удзельнікі семінара азнаёміліся з падыходамі ў ахове працы на месцы. У прыватнасці, работнікі гаспадаркі падзяліліся вопытам у арганізацыі рабочага працэсу ў рамонтных майстэрнях і на палях, а таксама метадамі арганізацыі харчавання для работнікаў сельскай гаспадаркі. Супрацоўнікі хуткай дапамогі паказалі, як аказваць першую дапамогу людзям пры розных траўмах: цеплавых і сонечных апёках, цеплавым удары, а таксама ў выпадку падзення работніка.

Супрацоўнікі ДАІ нагадалі аб важнасці захавання Правіл дарожнага руху, расказалі аб найбольш распаўсюджаных парушэннях, якія могуць прывесці да

# УРАДЖАЙ ЛЮЛЯЕ

ўраджаю і павышае эфектыўнасць працы. Палеглыя пасевы ўбіраюць камбайнамі са сцеблапад'ёмнікамі, каб мінімізаваць страты, калі жніво ідзе ў складаных умовах. Усе дзесяць гаспадарак Бярозаўскага раёна даволі ўстойлівыя фінансава і забяспечаны ўсім неабходным. Паводле вынікаў мінулых гадоў, кожнае сельгаспрадпрыемства стараецца справіцца ўласнымі сіламі, перакідваць тэхніку на дапамогу з іншых участкаў не даводзіцца. Вымушаныя перапынкі — з-за дажджу — механізатары скарыстоўваюць на догляд тэхнікі: нешта змазаць, пачысціць, наладзіць.

І ўсё адно чакаюць: дождж жа не на ўвесь дзень!.. Сонейка крыху прасушыла — і выязджаюць у поле. Гаспадаркі інспектуюцца штодня — каб не было парушэнняў. Але і кіраўнікі зацікаўлены ўвесь час трымаць сітуацыю са жнівом на кантролі. Самае галоўнае, што камбайнеры і самі сочаць за тым, каб працаваць без страт — гэта іх адказнасць. І заробак!..

## ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

Не сакрэт, што жніво — прыбытковая справа для механізатараў, якія працуюць добрасумленна і дбайна. Такога няма, каб камбайны прастойвалі. Некаторыя гаспадаркі на час жніва прыцягваюць спецыялістаў, якія не першы год далучаюцца да ўборачнай кампаніі і добра ведаюць справу — вучыць не трэба. Ёсць асобы, якія вяртаюцца летам у гаспадаркі, дзе ўжо давялося працаваць раней. Прыемна адзначыць, што сярод пасяховых механізатараў ёсць маладыя людзі.

— У нашым раёне сем маладзёжных экіпажаў (калі працуюць два маладыя чалавекі да 31 года). Ёсць адзін камбайн, на якім працуе адзін чалавек. І адзін экіпаж з асоб, прыцягнутых з іншых арганізацый і ўстаноў: так падключыліся да ўборкі Андрэй Углянец з Жабінкаўскага цукровага завода і Аляксандр Зейф, студэнт БДАТУ, — яны ўжо 3 гады разам ездзяць, —





адзначае **Паліна РУДЗЬ, галоўны спецыяліст упраўлення па сельскай гаспадарцы Бярозаўскага райвыканкама**, якая скончыла з чырвоным дыпломам Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію, што ў Горках. Маючы за плячыма дзве вышэйшыя адукацыі, дзяўчына знайшла працу па спецыяльнасці на радзіме: яна ведае ўсё пра тых, для каго жніво — частка жыцця. А бывае так, што і вялікая частка сямейнай гісторыі.

Напрыклад, у Бярозаўскім раёне цяпер на жніве занятыя пяць сямейных экіпажаў. Але ёсць і вельмі адметныя экіпажы, якія складаюцца з блізкіх сваякоў, прадстаўнікоў адной працоўнай дынастыі. Вось як Рамановічы з ТАА «Вінец», што ў вёсцы Равячычы. У гэтай гаспадарцы працавалі бацькі Сяргея Васільевіча і Аляксандра Васільевіча. Тут жа пачалі сваю працоўную дзейнасць і браты Рамановічы, штогод у якасці камбайнераў далучаліся да ўборкі ўраджаю. Працуючы ў пары станавіліся пераможцамі раённых, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў. А калі падраслі іх сыны, таксама сталі дапамагаць бацькам. Сёлета Аляксандр Васільевіч Рамановіч працуе на камбайне разам з пляменнікам Дзмітрыем *(на здымку)*, які... у звычайным жыцці, па-за ўборачнай кампаніяй, з'яўляецца настаўнікам фізічнай культуры школы № 1 горада Бярозы. Падключыўся на летні перыяд да важнай справы, бо цяпер той час, калі летні дзень год корміць. І гэта не толькі прыгожая метафара, так ёсць насамрэч...

Гэта справядліва як у дачыненні да канкрэтнага чалавека альбо людзей, спецыялістаў, так і для краіны наогул. На жніве важны кожны дзень. Таму калі ўмовы спрыяюць — камбайны адразу выходзяць у поле. А калі ў якісьці дзень уборкі няма, то ў гаспадарках прэсуюць салому — каб ачысціць палі пад пасевы ўраджаю 2026 года...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
**Фота з архіва герояў і bereza.by.**

# І НАДЗВЫЧАЙНЫХ ЗДАРЭННЯЎ

## могуць быць мінімізаваны, калі трымацца тэхналогій і дысцыпліны

ДТЗ. Яны таксама падказалі, як пазбегнуць парушэнняў пры эксплуатацыі тэхнікі. Супрацоўнікі МНС нагадалі аб неабходнасці захавання мер пажарнай бяспекі падчас уборкі ўраджаю. Яны расказалі аб парадку дзеянняў у выпадку пажару і ўзгарання ў месцах уборкі і пры эксплуатацыі тэхнікі і абсталявання.

— Вельмі важна, каб уборачная кампанія прайшла без здарэнняў, а гэта магчыма, калі ўсе будуць выконваць правілы аховы працы і прытрымлівацца іх. Для агульнага спакою ўся тэхніка ў гаспадарцы застрахавана, работнікі таксама ходзяць у форме і спецыяльным абутку, — адзначыў **старшыня Навагрудскага райвыканкама Сяргей ЧАРКОЎСКІ**.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны абвясціла 2025-ы годам бяспечнай працы ў сельскай гаспадарцы, расказаў **галоўны тэхнічны інспектар Гродзенскай абласной прафсаюзнай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Віталь КРЫШТОПІК**:

— У прыярытэце — забеспячэнне бяспекі працы. Неабходна своечасова выяўляць патэнцыяльныя пагрозы для супрацоўнікаў і прымаць меры






для іх прадухілення ці мінімізацыі. Для гэтага выкарыстоўваюцца сродкі індывідуальнай аховы, а таксама бяспечныя прылады, абсталяванне і метады працы.

Бяспеку на ўборцы павялічвае і ўдасканаленне тэхнікі. **Мікалай ДАРАШКЕВІЧ** працуе на палях ужо 44 гады. За гэты час ён паспеў пабываць на борце вялікай колькасці тэхнікі.

— Якасць тэхнікі мінулых гадоў нельга параўнаць з сучаснай. Працаваць вельмі камфортна, бяспечна. За гэтыя дзесяцігоддзі многае змянілася ў лепшы бок і адпавядае ўсім сучасным нормам. Шмат гадоў я быў за рулём камбайна, цяпер працую на прэсе для саломы, — падзяліўся **супрацоўнік СПК «Нягневічы» Мікалай ДАРАШКЕВІЧ**.

Як падкрэсліў **Ігар САРОКІН**, які ўзначальвае **камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта**, прадстаўлены вопыт будзе карысны і кіраўнікам профільных упраўленняў рэгіёна.

— Пытанні бяспекі — гэта галоўнае ва ўборачнай кампаніі. Безумоўна, кожны з нас павінен быць уцягнуты ў працэс і імкнуцца да паляпшэння сітуацыі, калі бачыць парушэнні правілаў бяспекі, — адзначыў Ігар Сарокін.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, фота аўтара.**

# АБНОЎКІ ДА ШКОЛЫ ПА КІШЭНІ

## Рэгуляванне цэн распаўсюджваецца і на тавары школьнага асартыменту



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**З улікам старту сезона актыўнай падрыхтоўкі да новага навучальнага года ў МАРГ нагадалі, што рэгуляванне цэн, уведзенае пастановай Урада № 713, таксама ажыццяўляецца ў дачыненні да тавараў школьнага асартыменту: гаворка ідзе пра адзенне і абутак, асобныя пісьмовыя тавары і канцылярскія прылады, а таксама заплечнікі, ранцы вучнёўскія і школьныя.**

Рэгулятар звяртае ўвагу, што за парушэнне ўстаноўленых гранічных надбавак юрыдычная асоба можа быць аштрафавана ў двухразовым памеры розніцы паміж фактычнай выручкай, атрыманай ад рэалізацыі тавараў, і разліковай велічынёй выручкі ад рэалізацыі гэтых тавараў па цэнах, устаноўленых у адпаведнасці з заканадаўствам; індывідуальны прадпрымальнік — у памеры 20 базавых велічынь.

Для вывучэння сітуацыі з цэнамі на рынку школьных тавараў МАРГ праводзіць адпаведныя кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы.

Акрамя таго, рэгулятар накіраваў інфармацыйныя лісты аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму аб неабходнасці прыняцця мер па насычэнні гандлёвых аб'ектаў шырокім асартыментам школьных тавараў у рэгіёнах і кантролі за фарміраваннем цэн на названыя тавары з захаваннем дзейнага рэгулявання цэн.

### У тэму

### У БЕЛАРУСІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА АТРЫМАННЕ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ДА ШКОЛЫ

Сацыяльная накіраванасць палітыкі нашай дзяржавы рэалізуецца і праз аказанне матэрыяльнай дапамогі сем'ям на падрыхтоўку дзяцей да новага навучальнага года.

Як расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, аднаразовая матэрыяльная дапамога прадастаўляецца шматдзетным сем'ям (якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей) незалежна ад даходу сям'і.

Памер выплаты на кожнага школьніка складае 30 % БПМ, які будзе дзейнічаць на 1 жніўня 2025 года.

**Куды звяртацца?**

У орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання) аднаго з бацькоў дзіцяці, у Мінску, асобных раёнах Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцей — па месцы вучобы дзіцяці.

У профільным міністэрстве нагадалі, што сёлета такую дапамогу атрымаюць каля 240 тысяч школьнікаў з больш як 115 тысяч шматдзетных сем'яў.

Таксама прадугледжана дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога малазабяспечаным сем'ям (у тым ліку шматдзетным).

Памер выплат вызначаецца раённымі камісіямі ў кожным выпадку індывідуальна зыходзячы з даходу сям'і і канкрэтнай жыццёвай сітуацыі.

**Куды звяртацца?**

У службу «Адно акно» мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне (тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва) у адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання) аднаго з бацькоў.

Акрамя гэтага, бацькі могуць разлічваць на матэрыяльную дапамогу па месцы работы.

Так, супрацоўнікам, якія выхоўваюць дзяцей-школьнікаў, дапамога можа быць аказана па месцы работы ў адпаведнасці з калектыўнымі дагаворамі, лакальнымі актамі наймальніка.

Не варта забываць і пра дабрачынную дапамогу.

У прыватнасці, у ліпені—жніўні па ўсёй краіне пройдуць дабрачынныя акцыі, арганізаваныя ТЦСАН, фондамі і грамадскімі аб'яднаннямі, напрыклад «Школьны ранец», «Збяры дзіця ў школу», «У школу з усмешкай», «Партфель першакласніка».

Варта звяртацца:

у мясцовыя ТЦСАН, дабрачынныя арганізацыі.

Дарэчы, матэрыяльная дапамога да школы пераводзіцца на базавы рахунак.

# АМАЛЬ 200 МЛН РУБЛЁЎ НА ШЭСЦЬ НОВЫХ АБ'ЕКТАЎ

**Банкам развіцця падведзены вынікі конкурснага адбору інвестпраектаў па будаўніцтве МТФ.**



Пераможцамі прызнаны шэсць сельскагаспадарчых арганізацый. Для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў фінансавым інстытутам будзе накіравана 198 мільёнаў рублёў, паведамілі ў банку.

Так, у Брэсцкай вобласці будзе рэалізавана два інвестыцыйныя праекты. У ААТ «Тышкавічы-Агра» Іванаўскага раёна пабудуюць кароўнік на 340 стойлавых месцаў на МТФ «Тышкавічы», а ў ААТ «Агра-Пелішча» Камянецкага раёна будзе ўзведзена малочнатаварная ферма на 760 галоў.

У Гродзенскай вобласці з'явіцца тры новыя сельскагаспадарчыя аб'екты. У СВК імя Дзеньшчыкава пабудуюць малочнатаварны комплекс на 1200 кароў каля вёскі Кунцаўшчына Гродзенскага раёна, у РСКУП «Ваўкавыскае» — два кароўнікі і даільна-малочны блок каля вёскі Залучаны Ваўкавыскага раёна, а ў ДП «Мацвееўцы» будзе рэалізаваны інвестпраект па будаўніцтве малочнатаварнай фермы на 777 галоў у раёне аграгарадка Мацвееўцы Ваўкавыскага раёна.

Таксама ў Мінскай вобласці ў ААТ «Новая Вілія» будзе пабудавана малочнатаварная ферма паблізу вёскі Фалькі Вілейскага раёна Мінскай вобласці.

Да канца бягучага года Банкам развіцця плануецца правядзенне яшчэ двух конкурсных адбораў: па будаўніцтве і рэканструкцыі МТФ і пладасховішчаў.

Акрамя фінансавання і поўнага суправаджэння праектаў яшчэ на пачатковым этапе Банк развіцця пры неабходнасці кансультуе па пытаннях падрыхтоўкі пакета дакументаў на атрыманне інвестыцыйных крэдытаў.

# ХАЙ ДОБРЫ БУДЗЕ ШЛЯХ!



**На калегіі Мінтранса разгледзелі выкананне падведамнымі арганізацыямі рэспубліканскага і галіновага планаў мерапрыемстваў па правядзенні ў 2025-м Года добраўпарадкавання.**

Як расказалі ў ведамстве, калегія прайшла пад кіраўніцтвам міністра транспарту і камунікацый Аляксея Ляхновіча. Удзельнікі падрабязна абмеркавалі дасягнутыя вынікі, а таксама выяўленыя недахопы ў рабоце арганізацый дарожнай гаспадаркі, чыгуначнага, аўтамабільнага, авіяцыйнага і воднага транспарту. У цэлым было адзначана, што сітуацыя з выкананнем даведзеных заданняў у галіне станоўчая.

Так, у студзені — чэрвені ўладальнікамі рэспубліканскіх аўтадарог праведзены работы па падтрыманні ў належным стане тэрыторый удоўж трас.

Выкананы бягучы рамонт парадку 700 км дарожных пакрыццяў, азеляненне 40 тэрыторый плошчай 146,7 тысячы кв. м (высаджана больш за 25 тысяч дрэў і кустоў). Устаноўлены 133 апоры вонкавага асвятлення. На пляцоўках адпачынку адрамантавана і добраўпарадкавана 63 малыя архітэктурныя формы. У палосах адводу 1516 км расчышчаны ад смецця і расліннасці.

Ажыццёўлены работы па навядзенні парадку ўздоўж чыгунак. У прыватнасці, уладкаваны 37 прыпынačных пунктаў і 12 пасажырскіх платформаў, расчышчаны ад адходаў і ламанай драўніны 1122 км, адрамантаваны 64,7 км чыгуначных пуцей, вядзецца рамонт прылад вонкавага асвятлення.

Аляксей Ляхновіч акцэнтаваў увагу кіраўнікоў на неабходнасці кантраляваць выкананне заданняў па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні не толькі на аб'ектах транспартнай інфраструктуры, але і ў саміх арганізацыях — на тэрыторыі прадпрыемстваў, вытворчых памяшканняў, удзяляючы таксама ўвагу знешняму выгляду будынкаў і збудаванняў.

# АКТЫЎНАСЦЬ ВІТАЕЦЦА

**За першае паўгоддзе ў краіне рэалізавана 84 праекты ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект».**



Як паведамілі ў Мінэканомікі, па выніках першага паўгоддзя 2025 года тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал да аналагічнага перыяду 2024-га склаў 114 %.

У прыватнасці, адзначаецца рост укладанняў у вытворчую базу і тэхналагічнае абнаўленне: выдаткі на набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў — «плюс» 20,3 %.

— Тым самым фарміруецца задзел для павышэння эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці дзейных прадпрыемстваў, — растлумачылі ў эканамічным ведамстве.

У тэрытарыяльным разрэзе лідарамі выступаюць Мінская вобласць (тэмп росту 119,6 %), Гомельская (118,4 %), Магілёўская (114,5 %) і Брэсцкая вобласці (113,1 %).

Значны ўклад у развіццё рэгіёнаў уносіць ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект»: на 1 ліпеня 2025 года завершана рэалізацыя 84 праектаў, створана каля 5,8 тысячы новых працоўных месцаў.

У гэтым перыядзе ў ТОП-3 праектаў па прыцягнутых інвестыцыях у асноўны капітал увайшлі інвестпраекты Светлагорскага ЦКК, агракамбіната «Дзяржынскі» і Мінскага гарадскога тэхнапарка.

# РАЗЛІК У ТЭРМІН

**Падатковыя органы нагадваюць аб аплаце маёмасных падаткаў адзіным маёмасным плацяжом.**

Так, фізічныя асобы з'яўляюцца плацельшчыкамі трох маёмасных падаткаў: зямельнага, на нерухомасць і транспартнага. Выплата маёмасных падаткаў ажыццяўляецца адзіным маёмасным плацяжом на адзін бюджэтны рахунак.



Падатковы орган самастойна зробіць разлік маёмасных падаткаў за 2024 год і накіруе фізічным асобам паведамленне на іх выплату. У паведамленні паказваюцца ўсе аб'екты падаткаабкладання маёмаснымі падаткамі, якія належаць плацельшчыку.

Існуюць два спосабы накіравання паведамленняў:

— з дапамогай паштовай сувязі;

— у асабісты кабінет плацельшчыка на сайце МПЗ — тым, хто даў сваю згоду на накіраванне паведамлення такім спосабам.

Тэрмін уручэння фізічным асобам паведамленняў на выплату маёмасных падаткаў адзіным маёмасным плацяжом — не пазней за 1 кастрычніка 2025 года.

Выплату адзінага маёмаснага плацяжу за 2024 год неабходна ажыццявіць не пазней за 17 лістапада 2025 года (з улікам таго, што 15 і 16 лістапада 2025 года з'яўляюцца выхаднымі днямі). Варта звярнуць увагу, што фізічныя асобы маюць права аплаціць падаткі часткамі і датэрмінова.

Зрабіць аплату адзінага маёмаснага плацяжу можна любым зручным для плацельшчыка спосабам:

— праз сэрвіс «Асабісты кабінет плацельшчыка»;

— з дапамогай сістэмы АРІП;

— у аддзяленнях банкаў і паштовай сувязі наяўнымі грашовымі сродкамі альбо з выкарыстаннем банкаўскай плацежнай карты.



# Эканоміка прапановы



## Як зрабіць, каб дадатковыя даходы хоць бы часткова назапашваліся, а не выплюхваліся на спажывецкі рынак?

**Нацыянальны банк і Урад паставілі для сябе стратэгічны арыенцір: актывізаваць інвестыцыйны цыкл, за кошт мадэрнізацыі павышаць прадукцыйнасць працы, нарошчваць вытворчасць і, адпаведна, павялічваць прапанову. Зыходзячы са стратэгіі эканомікі прапановы Нацыянальны банк і праводзіць сваю палітыку, у тым ліку павысіў стаўку рэфінансавання на 0,25 працэнтнага пункта.**

Уласна кажучы, такія дзеянні Нацыянальнага банка не былі безальтэрнатыўнымі, але цалкам прадказальнымі. Кіраўнікі рэгулятара вясной агучвалі сваю прынцыповую пазіцыю па арыентаванні банкаўскага сектара на інвестыцыйнае крэдытаванне, адначасова змяншаючы дынаміку выдачы спажывецкіх крэдытаў. Рэальныя наяўныя даходы насельніцтва за пяць месяцаў гэтага года павялічыліся на 10,5 %, рэальная заработная плата — на 11,4 %.

Павышэнне дабрабыту насельніцтва — адна са стратэгічных мэт дзяржавы, прапісаная ў сістэмных дакументах. У павышэнні заробкаў няма праблемы як такой. Наадварот, гэта неабходна рабіць, каб забяспечыць канкурэнтаздольнасць беларускіх вакансій на рэгіянальным узроўні, тым самым знізіўшы працоўную міграцыю. Але складанасць узнікае, калі дадатковыя даходы ў поўнай меры выходзяць на спажывецкі рынак. Больш за тое, заробкі, якія растуць, павышаюць не толькі пакупніцкі патэнцыял, але і крэдытаздольнасць грамадзян. І ў банкаў з'яўляецца больш магчымасцяў выдаваць крэдыты. Прычым у немалой ступені пазыковыя рэсурсы стымулююць спажыванне замежных тавараў. Гэта стварае і інфляцыйныя перадумовы, і ў больш доўгатэрміновым перыядзе можа адбіцца на курсе нацыянальнай валюты.




У экспертным асяроддзі ёсць меркаванне, што наш рэгулятар дзейнічае недастаткова рашуча, павысіўшы стаўку рэфінансавання на няназначныя 0,25 працэнтнага пункта. У іншых дзяржавах рэгулятары на інфляцыю рэагуюць больш жорстка, паднімаючы ключавую стаўку часам кратна. Сапраўды, такіх кейсаў хапае і ў мінулым, і ў сучаснасці. Але, па-першае, некарэктна нейкія дзеянні фінансавых улад спрабаваць рабіць універсальнымі. У рэшце рэшт, у кожнай дзяржаве свая структура эканомікі і фінансавага рынку. Адпаведна, і ідэнтычна дзейнічаць у падобных сітуацыях немэтазгодна. Па-другое, эфектыўнасць тых ці іншых мер можна ацаніць толькі па выніку — дасягненні пастаўленай мэты. Калі стаіць задача проста задушыць або папярэдзіць інфляцыю — гэта адна гісторыя. Можна ціснуць на кошт крэдытных рэсурсаў, астуджаць унутраны попыт — і рост цэн можа ўвайсці ў патрэбную каляіну. Іншае пытанне, ці будзе сябе добра адчуваць рэальны сектар пры дарагіх пазыках? Адпаведна, як гэта адаб'ецца на грамадзянах, якія атрымліваюць заработную плату ў гэтым самым рэальным сектары? Калі дзелавая актыўнасць разам з дабрабытам будзе зніжацца, то радасць ад нізкай дынамікі індэкса спажывецкіх цэн не вельмі і парадуе.

Тым больш што нярэдка рэзка павышаюць стаўку ў дзяржавах, у якіх ёсць значны прафіцыт у знешнім гандлі або таварамі (як правіла, за кошт сыравіннага складніка), або паслугамі (напрыклад фінансавымі — як у Штатах). Высокія стаўкі крыху душаць унутраную вытворчасць, але заўсёды ёсць магчымасць закрыць бягучыя патрэбы па лініі імпарту. Да таго ж пры істотным прафіцыце гэта не паўплывае на курс нацыянальнай валюты. У Беларусі адсутнічаюць высокія даходы ад прыроднай рэнты. Таму нарошчваць імпарт немэтазгодна з усіх бакоў. Акрамя таго, наша эканоміка вельмі экспартаарыентаваная. І высокія крэдытныя стаўкі могуць біць па нашых пастаўках на замежныя рынкі.

Таму Нацыянальны банк, у дакладным узаемадзеянні з Урадам, выкарыстоўвае шырокі спектр інструментаў кіравання. І разам са стаўкай рэфінансавання ўжываюцца іншыя меры макрапрудэнцыйнага характару. Ключавая ж мэта не зрабіць крэдыты таннейшымі або даражэйшымі, а дасягнуць аптымальнага балансу. Сутнасць палітыкі Нацыянальнага банка — стварэнне ўмоў для пераходу людзей да ашчаднасці. Прынамсі, каб хоць бы часткова дадатковыя даходы акумуляваліся ў зберажэннях і ў меншай ступені выплюхваліся на спажывецкі рынак. Пры гэтым банкі рэсурсную базу выкарыстоўвалі б, у першую чаргу, для інвестыцыйнага крэдытавання, а не спажывецкага. Гэта не значыць, што грамадзян трэба поўнасцю адсекчы ад пазыковых рэсурсаў. Аднак зрабіць гэтыя аб'ёмы больш прымальнымі з пункту гледжання ўстойлівасці ў доўгатэрміновым перыядзе. Таму Нацыянальны банк і ўстанавіў мэтавы паказчык: рост патрабаванняў банкаў да грамадзян не павінен павялічыцца больш як на 12 % па выніках года па крэдытах на спажывецкія патрэбы.

Фінансавае стымуляванне інвестыцыйнага цыкла павінна павысіць і прадукцыйнасць, і прапанову тавараў і паслуг. Мадэрнізацыя ж патрэбна не дзеля самамэты, а каб і даходы насельніцтва павышаць, і адпаведны рост аб'ёмаў вытворчасці забяспечыць, каб высокія заробкі не з'яўляліся праінфляцыйным фактарам з усімі негатыўнымі наступствамі. Насамрэч, такая задача патрабуе вельмі тонкіх наладак. Таму акуратныя дзеянні Нацыянальнага банка цалкам вытлумачальныя. Зноў жа, галоўнае — не працэс, а дасягненне пастаўленых мэт. Калі казаць пра інвестыцыі, то яны за шэсць месяцаў выраслі на 14 % ў параўнанні з аналагічным перыядам 2024 года. Пры гэтым затраты на набыццё машын, абсталявання і транспартных сродкаў павялічыліся на 20,3 %. Важны паказчык з пункту гледжання індыкатара якаснага развіцця рэальнага сектара.



**Інтэлект ШТУЧНЫ**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор** | **ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1** |
| **Продавец** | **ОАО «Гомельдрев», 246042, г. Гомель, ул. Достоевского, 3** |

**Аукцион состоится 12.08.2025 в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.
**Заявление на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 29.07.2025 по 08.08.2025 до 16.00** по указанному адресу.
**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17; 8 (029) 651-22-19; 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

**Предмет аукциона:**

**ЛОТ № 1: Семь капитальных строений (здание многофункциональное** с инв. № 350/С-225870, пл. **1 353,6 кв. м; здание специализированное складов** с инв. № 350/С-225869, пл. **253,7 кв. м; здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей с инв. № 350/С-117185,** пл. **371,6 кв. м; здание многофункциональное** с инв. № 350/С-122651, пл. **609,3 кв. м, механическая мастерская по ремонту н/с оборудования** с инв. № 350/С-231509, пл. **278,2 кв. м, боксы для стоянки автомобилей** с инв. № 300/С-62004, пл. **703,8 кв. м, здание административно-хозяйственное** с инв. № 350/С-232061, пл. **780,0 кв. м).**
**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006000391** общей площадью **0,9889 га** – для строительства и обслуживания здания многофункционального, здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ и здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). **Право аренды (доля в праве 999/1000).**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 14.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.04.2025 г.
**Начальная цена с учетом НДС 20 % со снижением на 20 %: 1 535 136,00 бел. руб.**

**ЛОТ № 2: Административное здание** общей площадью **70,9 кв. м**, год постройки 2008. Составные части и принадлежности: **пристройка –** пл. застройки **2,0 кв. м, склад –** пл. застройки **16,0 кв. м, склад –** пл. застройки **29,0 кв. м, ворота металлические (ширина 4,27 м), забор деревянный (длина 272,67 м).**
**Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Шарпиловский с/с, д. Шарпиловка, ул. Советская, 211А.
**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321089803601000181,** общей площадью **0,4808 га** – для обслуживания производственной базы. **Право постоянного пользования**. **Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Шарпиловский с/с, д. Шарпиловка, ул. Советская, 211А.
Реализация объекта проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 330 от 19.09.2022 г. «О распоряжении имуществом».
С перечнем имеющейся документации на лот № 2 потенциальный покупатель может ознакомиться у организатора аукциона.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 06.06.2025 г.
**Начальная цена с учетом НДС 20 % со снижением на 10 %: 6 480,00 бел. руб.**

Задаток **5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с **Продавца (ОАО «Гомельдрев»):** Р/с BY58 AKBB 3012 0212 1501 6310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 400021353, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №№ 1, 2 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | В рабочие дни по предварительному согласованию **8 (029) 645-93-51, Андреев Глеб Геннадьевич** |

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола.
**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи.**
Рассрочка оплаты стоимости приобретенного имущества предоставляется по письменному заявлению Победителя аукциона (Претендента на покупку) в соответствии с законодательством. Имущество, проданное с рассрочкой оплаты, находится в залоге у Продавца для обеспечения исполненной Покупателем обязанности по оплате его цены в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Передача имущества Покупателю будет осуществляться после полной оплаты цены продажи объекта.
Проводится аукцион в соответствии с Положением ЗАО «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: **https://ocenkaservis.by (раздел Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**
**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17; 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30 (тридцати) календарных дней после проведения аукциона** |



ИНФОРМАЦИЯ ОБ АУКЦИОНЕ
ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ЖИЛОГО ДОМА

**Организатор аукциона:** Мядельский сельисполком Мядельского района Минской области, тел. 8 (01797) 40735, 22352.

**Дата проведения аукциона: 12 сентября 2025 г. в 14.00**

**Место проведения аукциона:**
**Минская обл., г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, к. 15.**

**Жилой дом № 5 в д. Перегродь Мядельского сельсовета Мядельского района Минской области;**
инв. номер 633/С-1798 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – одноэтажный деревянный жилой дом), общая жилая площадь – 63,4 кв. м, с дощатой холодной пристройкой, двумя дощатыми сараями, одним бревенчатым сараем. При доме имеется колодец.

**Начальная цена** 5 042,71 рублей
(пять тысяч сорок два рубля семьдесят одна копейка).

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by,** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by**, Мядельского районного исполнительного комитета **myadel.gov.by.**

УНП 600380436

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона с начальной ценой, равной одной базовой величине, по продаже имущества, принадлежащего
**УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»**
на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Аукцион состоится 14.08.2025 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1:**
37/158 доли в праве собственности на многоквартирный жилой дом с инв. № 420/С-3110.
Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Кирьяновцы, 57.
**Начальная цена без НДС** – 42,00 руб.

**Лот № 2:**
1/2 доли в праве на многоквартирный жилой дом с инв. № 421/С-4272.
Адрес: Гродненская обл., Вороновский р-н, Бастунский с/с, д. Бастуны, ул. Советская, 32.
**Начальная цена без НДС** – 42,00 руб.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению учреждения
**«Спортивно-охотничье профсоюзное хозяйство «Лавники»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже:

**Автомобиль легковой джип ВАЗ 21214-120-20, 2006 г. в.,**
временный регистрационный знак 7MX4870, кузов № XTA21214061807955, цвет темно-синий

**Начальная цена с НДС (20 %) – 3 000,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 300,00 бел. руб.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **29.08.2025** в **10.00.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.08.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра 8 (044) 732 61 72.**
УНП 691904966

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **ОАО «Городятичи-Агро»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

**Картофелеуборочного комбайна Grimme SE 75-30V, 2008 г. в.,**
инвентарный № 04276, заводской № 12304816.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 55 800,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 5 580,00 бел. руб.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **29.08.2025** в **10.00.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.08.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра 8 (044) 735 94 12.**
УНП 691447462

ПРАЦОЎНЫЯ ДЫНАСТЫІ

# АД КУЛЬМАНАЎ — ДА КАМП'ЮТАРНЫХ ПРАГРАМ

## Агульны стаж сям'і КОГАН на МТЗ складае 221 год

Мінскі трактарны завод без перабольшвання сёння можна назваць гонарам краіны. А гонар самога прадпрыемства — працоўныя дынастыі. Людзі, якія прысвяцілі рабоце на заводзе не адзін дзясятак гадоў, падарылі любоў да прафесіі сваім дзецям і ўнукам.
З адной з іх, дынастыяй Коган, якая летась адзначыла 70-годдзе свайго пачатку, мы пазнаёміліся бліжэй.



Анатоль Якаўлевіч КОГАН і яго пляменніца Таццяна КАМІНІНА.

Пачынальнікам дынастыі стаў Якаў Яўгенавіч Коган, які прыйшоў працаваць на завод у 1954 годзе. Спачатку шчыраваў мадэльшчыкам у мадэльным цэху, а потым перайшоў у цэх доследнай вытворчасці мадэльшчыкам па драўляных мадэлях. У 1971 годзе пачаў свой працоўны шлях на заводзе старэйшы сын Якава Яўгенавіча Яфім. Быў электраманцёрам у электрычным цэху, а пазней уладкаваўся ў сталеліцейны цэх, у службу энергетыкі. Тут жа, на родным прадпрыемстве, Яфім Якаўлевіч сустрэў і сваю спадарожніцу жыцця. Зоя Герасімаўна працавала земляробам у сталеліцейным цэху, была прыбіральшчыкам у механічным цэху № 4. Маладыя работнікі пакахалі адно аднаго, стварылі сям'ю і найлепшыя якасці — адказнасць, мэтанакіраванасць і любоў да сваёй справы — перадалі сваім дзецям.



У 1977 годзе прыйшоў працаваць на завод і малодшы сын Якава Яўгенавіча Анатоль. У 2000 годзе прадоўжыў працоўную сямейную дынастыю ўнук Яўген. На працягу сямнаццаці гадоў Яўген Яфімавіч працаваў старшым майстрам прэсавага цэха. А вось у 2006 годзе пачала свой працоўны шлях на прадпрыемстве ўнучка Таццяна Камініна.

Дзесяцігоддзі, аддадзеныя руплівай працы, сталі выдатным прыкладам для дзяцей і ўнукаў. Якаў Яўгенавіч стаў пераможцам сацспаборніцтваў у 1977 годзе і атрымаў ганаровае званне «Ударнік пяцігодкі». За шматгадовую добрасумленную працу ён быў узнагароджаны дзясяткамі ганаровых грамат. За шматлікія працоўныя дасягненні, вынаходніцтвы і рацыяналізатарскія прапановы Якаў Яўгенавіч стаў рацыяналізатарам прадпрыемства, на працягу многіх гадоў займаўся настаўніцтвам. Высокі прафесіянал, ён аддаў рабоце на заводзе 40 гадоў, стаў ветэранам працы, ганаровым ветэранам працы і ветэранам працы краіны.

Старэйшы сын Яфім Якаўлевіч адпрацаваў на МТЗ 44 гады, малодшы, Анатоль Якаўлевіч, шчыруе на заводзе 48 гадоў, жонка Яфіма Якаўлевіча Зоя Герасімаўна аддала рабоце тут 38 гадоў... Усе яны з'яўляюцца ветэранамі вытворчасці. Агульны працоўны стаж дынастыі складае 221 год.

### «ТРАКТАРНЫ ЗАВОД — ГЭТА ЎСЁ МАЁ ЖЫЦЦЁ...»

«Прызнаюся шчыра: мая работа з'яўляецца для мяне любімай справай, — кажа Анатоль Якаўлевіч, інжынер-канструктар першай катэгорыі аддзела галоўнага зваршчыка ўпраўлення галоўнага тэхнолага. — Работу на заводзе я пачаў, прайшоўшы службу ў арміі. Паколькі за плячыма ўжо была вучоба ў Мінскім энергетычным тэхнікуме, мяне прынялі на работу наладчыкам 5-га разраду аддзела галоўнага зваршчыка. Тут я і працую да цяперашняга часу. Скончыўшы завочна Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут па спецыяльнасці «Тэхналогія і абсталяванне зварачнай вытворчасці», я паступова павысіў сваю прафесіянальную кваліфікацыю і атрымаў першую прафесіянальную катэгорыю.

Цяпер Анатоль Якаўлевіч успамінае, як у былыя гады інжынеры-канструктары працавалі на кульманах — драўляных дошках з лінейкамі. З 2000 года, калі пачалі актыўна выкарыстоўвацца камп'ютары, арганізаваць работу стала нашмат прасцей. Цяпер, напрыклад, спецыяліст праектуе на камп'ютары зварачныя аснастку і прыстасаванні.

«Магу з упэўненасцю сказаць, што трактарны завод — гэта ўсё маё жыццё, — гаворыць Анатоль Якаўлевіч. — Калі я бачу, як па вуліцы едзе трактар, маё сэрца напаўняецца асаблівай радасцю: я — трактарабудаўнік! Шматгадовы вопыт, які мне ўдалося атрымаць на працягу працоўнага шляху, стаў надзейным фундаментам. Вельмі прыемна працаваць у калектыве аднадумцаў, сярод людзей, якія ў сваю работу ўкладваюць душу і дзеляцца з калегамі сваімі напрацоўкамі».

І хоць работа заўсёды займае шмат часу, Анатоль Якаўлевіч умее арганізаваць змястоўна свой адпачынак. Разам з удзельнікамі турыстычнага клуба «Грэнада», створаным пры заводзе, ён неаднойчы накіроўваўся ў паход, шмат падарожнічаў. Пабываў практычна ва ўсіх гарадах Беларусі, а таксама ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Казані, Іашкар-Але, Уладзіміры, Суздалі і многіх іншых. З экскурсіямі наведаў Польшчу, Германію, Венгрыю і г. д.

### ДОРЫЦЬ ЭНЕРГІЮ ПАДТРЫМКА КАЛЕГ

Знайшла сваё прызванне ў любімай прафесіі і пляменніца Анатоля Якаўлевіча Таццяна. У 2006 годзе яна ўладкавалася на работу лабарантам ва ўпраўленне металургіі і тэрмічнай апрацоўкі ліцейнага цэха № 2. Затым перайшла ў прэсавы цэх на пасаду інжынера па падрыхтоўцы вытворчасці, а пазней была прызначана эканамістам планава-эканамічнага ўпраўлення. З 2022 года Таццяна з'яўляецца начальнікам бюро планава-эканамічнага ўпраўлення (ліцейныя цэхі). Працуючы на заводзе, жанчына завочна скончыла Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва. Работа вельмі цікавая, таму што патрабуе пастаяннага самаўдасканалення, паглыблення ведаў.

Дачка Таццяны Анастасія сёлета скончыла школу і з лёгкасцю паступіла ў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, будзе набываць спецыяльнасць эканаміста. Хто ведае, магчыма, пройдзе час — і Анастасія таксама прыйдзе працаваць на завод, стане прадаўжальніцай працоўнай сямейнай дынастыі. Бацька Анастасіі Юрый працуе наладчыкам плазма-рэзальнага абсталявання прэсавага цэха.

Пасля завяршэння працоўных будняў Таццяна з задавальненнем займаецца вакальнай творчасцю, неаднойчы ўдзельнічала ў конкурсе «Спявай, BELARUS» і была яго пераможцай.

Суразмоўца шчыра прызналася ў тым, што якасці, якія цэніць у людзях, — шчырасць, спагаду і дабрыню, яна бачыць у сваіх калегах.

«Кожны дзень, прыходзячы на работу, разумею, што мае супрацоўнікі — гэта адна дружная сям'я, дзе кожны ў патрэбным выпадку рады падтрымаць іншага і добрым словам, і мудрай парадай. Напэўна, гэта і дорыць працоўную энергію і натхняе на ажыццяўленне новых задач».

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**

# ВЫБАР МАЛАДЫХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Лідарамі па колькасці пададзеных заяў сталі кірункі інжынернай справы, апрацоўчых вытворчасцяў, будаўніцтва, а таксама сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі і ветэрынарыі. На гэтыя прафесіі прыпадае каля 75 % усіх даступных сёлета месцаў.

Асаблівы акцэнт гэтай прыёмнай кампаніі зроблены на мэтавую падрыхтоўку. Для навучання па кірунках ад прадпрыемстваў і арганізацый выдзелена 5,5 тысячы месцаў. Гэта амаль на чвэрць больш, чым у 2024 годзе.

Энергетыка — падмурак сучаснай эканомікі. І кадры для гэтай галіны патрэбныя як ніколі. Па даных Мінэнерга, да 2026 года Беларусі дадаткова спатрэбіцца больш за тысячу электраманцёраў і тэхнікаў — столькі неабходна для маштабнай мадэрнізацыі энергасетак. Прафесіі запатрабаваныя ў абітурыентаў. Яскравы прыклад — Магілёўскі электратэхнічны каледж. З пачатку ўступнай кампаніі ўжо звыш 200 заяў прыняла прыёмная камісія — гэта на 20 % больш, чым год таму.

Па словах **адказнага сакратара прыёмнай камісіі Магілёўскага дзяржаўнага электратэхнічнага каледжа Вольгі ГУСАКОВАЙ,** сёлета прыёмная камісія насычаная за кошт таго, што вельмі шмат абітурыентаў хочуць паступіць:

— План прыёму каледж выканаў датэрмінова. Цяпер галоўнае — сярэдні бал атэстата. Калі ў 2024 годзе на «Тэхніка-электрыка» праходзілі з 7,3, то ў 2025-м канкурэнцыя відавочна будзе вышэйшай. Ілья Масейкаў — выпускнік гэтага каледжа і зноў абітурыент. Яго сярэдні бал — 8,3. Малады чалавек вярнуўся за новай кваліфікацыяй «тэхнік-электрык».

— Я тры гады адвучыўся ў гэтым каледжы, атрымаў чацвёрты разрад па мантажы, адвучыўся на кіроўцу катэгорыі С. Пасля заканчэння каледжа вырашыў пайсці на сярэднюю спецыяльную адукацыю, — расказаў хлопец.

Энергія маладых прафесіяналаў патрэбна па ўсёй вобласці, асабліва Шклоўскаму раёну. Тут па даручэнні Прэзідэнта ў 2026 годзе з'явіцца «Беларусь у мініяцюры» — будуюцца тры сучасныя ўзорныя прадпрыемствы АПК.

Але самыя перадавыя тэхналогіі — нішто без людзей. Шклоўскі каледж робіць акцэнт на падрыхтоўку кадраў для ключавых галін раёна. Акрамя трактарыстаў, электраманцёраў, муляроў летась тут запусцілі новую спецыяльнасць — «фельчар ветэрынарнай медыцыны».

Як расказала **намеснік дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце Шклоўскага дзяржаўнага каледжа Таццяна ЦАКУНОВА,** гэта спецыяльнасць была адкрыта тут летась:

— Аднак у гэтым годзе павялічаны набор. Летась было 25 чалавек, сёлета — 30. Назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці навучэнцаў у сувязі з патрэбай у дадзеных спецыялістах.

Сярод тых, хто ўжо падаў дакументы на новую спецыяльнасць, — Ірына Бардзюгова з Магілёўскага раёна. Падтрымаць дачку прыехала мама Людміла, яе вопыт у сельскай гаспадарцы — 30 гадоў. Выбар Ірыны — гэта і працяг сямейнай дынастыі, і вера ў будучыню беларускай вёскі.

— Яна мне дала адразу зразумець: мама, я іду па сельскай гаспадарцы, ветэрынарам. Я паглядзела: «Ты сапраўды ідзеш ветэрынарам?» — «Мама, я пайду». І ўсё, яна ўжо гады два гэтым трызніць, яшчэ ў школе вучылася: «Пайду з 9 класа», — расказала мама абітурыенткі.

Сама ж дзяўчына дадала:

— Веру, што там можна грошы зарабіць. У мяне гэта была не першая прафесія, я выбірала шмат. МУС, кінолаг, заатэхнік — шмат кім хацела быць. Але канчаткова спынілася на ветэрынарыі.

Гісторыі герояў матэрыялу не проста чыйсьці выбар, а ўжо трэнд! Усё больш беларускіх школьнікаў свядома бачаць сваю будучыню ў рабочых прафесіях. Амаль палова выпускнікоў дзявятых класаў сёння «галасуюць» за каледжы.

І эканоміка актыўна падтрымлівае гэты выбар. Толькі летась план прыёму ў ССНУ быў павялічаны дадаткова на тысячу месцаў, дасягнуўшы парадку 50 тысяч — настолькі вялікі попыт на кваліфікаваныя кадры для энергетыкі, АПК, будаўніцтва і іншых ключавых галін. Гэта шлях пакалення: хуткага старту, запатрабаванай прафесіі і годнай працы. Каб будаваць будучыню Беларусі ўжо сёння.

**Па матэрыялах СТБ.**

### Агульны план набору на ўзровень ССА ў каледжах – 38,6 тыс. навучэнцаў

**Размеркаванне месцаў наступнае:**

- 21,1 тыс. – для выпускнікоў 9-х класаў;
- 6,6 тыс. – для выпускнікоў 11-х класаў;
- 640 – для навучэнцаў з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.
- 28,3 тыс. юнакоў і дзяўчат будуць вучыцца на бюджэтнай дзённай форме навучання;
- на завочныя аддзяленні плануецца прыняць 1,4 тыс. чалавек.

### Прыём дакументаў для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі будзе ажыццяўляцца да 17 жніўня

**На аснове базавай адукацыі**

- за кошт сродкаў бюджэту падача дакументаў – да 1 жніўня;
- на платнай аснове – да 12 жніўня.

**На аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі**

- на бюджэтную форму навучання – да 6 жніўня;
- на платнай аснове – да 14 жніўня.

Прыём дакументаў для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі – да 23 жніўня.

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества в связи с неоплатой жилищно-коммунальных услуг.

**Электронные торги состоятся 29.08.2025.**

**Лот № 1:**
Квартира 70 с инв. № 500/D-644217, 37,1 кв. м.
Обременение: запрет на отчуждение (постановление судебного исполнителя от 03.10.2017), при продаже жилого помещения будет снят.
Правоудостоверяющие и технические документы на квартиру отсутствуют.
Отсутствует возможность осмотра квартиры.
Адрес: г. Минск, ул. Жуковского, д. 27, кв. 70.
Начальная цена без учета НДС – 146 000,00 руб.
Задаток – 14 600,00 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Продавец – Администрация Октябрьского района г. Минска.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 27.08.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ОДНОЭТАПНОГО КОНКУРСА

Организатор конкурса:
**Совместное общество с ограниченной ответственностью «Мобильные ТелеСистемы»**

Место нахождения:
220012, Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 95-4

Предмет закупки:

**УСЛУГИ ОБЯЗАТЕЛЬНОГО АУДИТА ГОДОВОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ СООО «Мобильные ТелеСистемы»,**
составленной в соответствии с законодательством Республики Беларусь на 31.12.2025.

Объемы закупки: в соответствии с предусмотренным Перечнем вопросов, подлежащих проверке в ходе обязательного аудита годовой бухгалтерской и (или) финансовой отчетности (Приложение к национальным правилам аудиторской деятельности «Планирование аудита», утвержденным постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 04.08.2000 № 81).

Источник финансирования закупки: собственные средства Организатора.

Срок проведения аудита: 15.01.2026–13.03.2026.

Проверяемый период: 2025 г.

Порядок проведения конкурса определен конкурсными документами. Полный пакет закупочных документов может быть получен заинтересованными участниками начиная с 29.07.2025 по 27.08.2025 с 9:00 до 16:00 часов с понедельника по пятницу на основании письменной заявки, направленной Заказчику по адресу: 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95-4 либо по электронной почте smalina@mts.by, а также в открытом доступе на сайте Заказчика в разделе https://www.mts.by/company/partner/purchases/

Коммерческие предложения должны быть доставлены в запечатанном виде для вскрытия по адресу: 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95-4.

Конечный срок подачи конкурсных предложений на бумажном носителе: 12:00 по местному времени 28.08.2025.

Вскрытие конкурсных предложений осуществляет конкурсная комиссия без участия представителей участников.

Вскрытие конкурсных предложений состоится в 15:00 по местному времени 28.08.2025.

Информация о допуске юридических и физических лиц к участию в процедуре закупки:

К участию в конкурсе допускаются участники: аудиторские организации – юридические лица (организации, индивидуальные предприниматели), в установленном порядке имеющие право оказания соответствующих аудиторских услуг на территории Республики Беларусь.

**Контактный телефон +375 29 7776727.**
УНП 800013732

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: **Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685*

**Торги проводятся 25.08.2025 г. ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.**

**Право заключения договора аренды на изолированное помещение с инв. № 500/D-798794181,**
**расположенное по адресу: г. Минск, ул. Аладовых, д. 11Б-60.**

Окончание приема заявлений – **20.08.2025, до 15.00.**

Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**
УНП 192605364

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский винодельческий завод», 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10. УНП 400051877 |

**Предмет электронных торгов – оборудование (б/у)**
**Местонахождение –**
**Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Ульянова, 2**

| № лота | инв. № | Наименование оборудования | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | 001664 | Автомат асептического разлива TBA-3 1л | 93 890,00 |
| | 001666 | Машина для упаковки термоусадки | |
| 2. | 001665 | Автомат асептического разлива 0,2 л | 73 790,00 |
| | 001668 | Обондероливающая машина 0,2 л | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638.

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**11.08.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **08.08.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже права заключения договора аренды имущества, находящегося в республиканской собственности

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00175** по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Минское отделение Белорусской железной дороги», г. Орша, ул. Константина Заслонова, 3, тел. 80216503733.

**Организатор, Оператор ЭТП ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by**.

**Дата и время проведения торгов: 27.08.2025 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения с инв. № 240/С-31265 (части площади пола), (наименование – здание вокзала) – площадь пола 1,0 кв. м на 1-м этаже по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Феликса Дзержинского, 8. Целевое использование: размещение снекового вендингового автомата, вендингового автомата для детей, вендингового автомата по продаже средств гигиены и др. бытовых мелочей, банкомата или информационного терминала. Размер коэффициента спроса на недвижимое имущество, его техническое состояние и коммерческую выгоду от сдачи в аренду – 3,0.

**Нач. цена: 39,89 руб.**

Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ (№ 32102) на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru/.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ АУКЦИОНЕ
ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ЖИЛОГО ДОМА

**Организатор аукциона:** Мядельский сельисполком Мядельского района Минской области, тел. (801797) 40735, 22352.

**Дата проведения аукциона: 19 сентября 2025 г. в 14.00**

**Место проведения аукциона:**
**Минская обл., г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, к. 15**

**Жилой дом № 50 по ул. Центральная, д. Азарки-Пудовинка Мядельского сельсовета Мядельского района Минской области;**

инв. номер 633/С-3550 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – одноэтажный бревенчатый жилой дом), общая жилая площадь – 44,2 кв. м, с двумя дощатыми холодными пристройками, тремя дощатыми сараями, одним бревенчатым сараем, гаражом, бревенчатой баней. При доме имеется колодец.

**Начальная цена** 6 525,86 рублей
(шесть тысяч пятьсот двадцать пять рублей восемьдесят шесть копеек).

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by,** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by,** Мядельского районного исполнительного комитета **myadel.gov.by**

УНП 600380436

АДУКАЦЫЯ

# ВУЧОБА ПАСЛЯ ВУЧОБЫ

## Магістратура: што гэта і чаго чакаць пасля

Сёння наступная пасля бакалаўрыята ступень навучання ўспрымаецца не толькі як працяг акадэмічнай адукацыі, але і як прастора пераходу: ад студэнцкага жыцця да прафесійнай самарэалізацыі. Хтосьці абірае яе, каб паглыбіцца ў спецыяльнасць, іншыя — каб выйграць некалькі месяцаў і знайсці сябе, або проста павысіць канкурэнтаздольнасць на рынку працы. Ёсць і тыя, хто трапляе сюды выпадкова, па інерцыі, не ведаючы, што рабіць далей. Прапануем вашай увазе развагі пра тое, што сёння насамрэч справе ўяўляе з сябе магістратура, як яна змяняе чалавека і ці заўсёды вядзе туды, куды хочацца.

Паступленне ў магістратуру для многіх бакалаўраў становіцца асэнсаваным рашэннем: працягваць навучанне, каб зрабіць наступны крок у прафесіі ці ў навуцы, адкрыць для сябе новыя метады, падыходы, міждысцыплінарныя сувязі. Універсітэты адказваюць на гэты запыт спецыялізаванымі праграмамі, магчымасцю навуковай дзейнасці, стажыровак і ўдзелу ў рэальных праектах. Магістранты не проста слухаюць лекцыі — яны вучацца думаць сістэмна, даследаваць, фармуляваць, абараняць свае ідэі. Менавіта на ўзроўні магістратуры з'яўляецца разуменне, як прымяняць веды ў рэальных умовах, як будаваць сваю адукацыйную і прафесійную траекторыю. Гэта ўжо не вучоба дзеля дыплома, а свядомая інвестыцыя ў будучыню, у сябе, у сваю кампетэнтнасць.



Але пытанняў усё роўна шмат. Як выглядае сучасная магістратура? Што прапаноўваюць універсітэты? Як вучацца студэнты і якія мэты перад сабой ставяць? І самае галоўнае: як атрыманыя навыкі дапамагаюць ім упэўнена ўваходзіць у прафесійнае жыццё?

### КУРС НА ЯКАСЦЬ І РОСТ

Аб асаблівасцях навучання на другой ступені, запатрабаваных кірунках і сучасных выкліках акадэмічнай адукацыі расказвае **прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі Віктар КОЧЫН.**

«Магістратура сёння займае важнае месца ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі, прадстаўляючы сабой не толькі наступны ўзровень навучання, але і самастойны этап акадэмічнага і прафесійнага развіцця», — падкрэсліў прарэктар БДУ. Паводле яго слоў, менавіта на гэтым узроўні адбываецца пераход да навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці.

**Сёлета ў магістратуру Белдзяржуніверсітэта залічылі 511 студэнтаў. У БДУ адзначаюць рост цікавасці да сваіх адукацыйных праграм з боку замежных грамадзян, што пацвярджае міжнародны аўтарытэт установы адукацыі: яна ўваходзіць у адзін працэнт найлепшых універсітэтаў свету паводле аўтарытэтных міжнародных рэйтынгаў.**

Найбольшую цікавасць у замежных студэнтаў выклікалі магістарскія праграмы эканамічнага кірунку, у галіне міжнародных адносін і журналістыкі. Сярод беларускіх студэнтаў папулярнасць размеркавана больш раўнамерна.

Пры гэтым універсітэт працягвае адкрываць новыя адукацыйныя галіны — гэта адказ на запыты рынку працы, змены ў тэхналагічных і навуковых трэндах. Паводле статыстыкі ВНУ, выпускнікі магістратуры найбольш запатрабаваныя ў трох ключавых сферах: адукацыі, навуцы і інавацыйнай эканоміцы. Сістэма размеркавання і аналітычнага суправаджэння магістраў дазваляе ўніверсітэту адсочваць іх прафесійную траекторыю і якасна наладжваць зваротную сувязь.

Як адзначыў Віктар Кочын, магістратура значна адрозніваецца ад бакалаўрыята. Найперш яна патрабуе большай ступені самастойнасці: навучэнцы актыўна працуюць з крыніцамі, рыхтуюць дысертацыі, атрымліваюць педагагічныя кампетэнцыі, неабходныя для выкладчыцкай работы. Падчас навучання магістранты ўдзельнічаюць у навукова-даследчых праектах, інтэгруюцца ў акадэмічныя калектывы і практыкуюцца ў прафесійным асяроддзі. Гэта не толькі спрыяе практычнаму замацаванню ведаў, але і стварае аснову для будучай кар'еры — разам з актыўным удзелам у грамадскім жыцці ўніверсітэта: у студэнцкім самакіраванні, валанцёрскіх ініцыятывах, медыя. БДУ таксама забяспечвае шырокі спектр падтрымкі не толькі для звычайных студэнтаў, але і для магістрантаў: стыпендыі, удзел у міжнародных стажыроўках, псіхалагічнае кансультаванне і іншыя механізмы сацыяльнай і прафесійнай адаптацыі.

Паводле слоў Віктара Кочына, у апошнія гады магістратура перастала быць пляцоўкай выключна для падрыхтоўкі да навуковай кар'еры. Яна ўсё больш запатрабавана сярод тых, хто імкнецца да практыкаарыентаванай адукацыі, хто хоча паглыбіць свае кампетэнцыі. Сучасныя магістранты дакладна разумеюць, што яны хочуць атрымаць, і ўсё часцей звязваюць навучанне з канкрэтнымі задачамі прафесійнай рэалізацыі.

### УСПАМІНЫ, ЯКІЯ ГРЭЮЦЬ ДУШУ

Мая суразмоўца **Ганна КАЛІНІНА** зусім нядаўна, у чэрвені, скончыла магістратуру па спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства». Яна прызнаецца: культурнае жыццё краіны заўсёды захапляла яе, таму пытанне, які кірунак абраць, не было складаным. Ганна падкрэслівае, што з самага пачатку перад ёй стаяла толькі адна мэта: адкрыць для сябе мастацтва з новага боку.

На пытанне, чым для яе за год навучання стала магістратура, суразмоўніца адказвае: «Гэта не толькі працяг акадэмічнага шляху, але і новы этап асобаснага росту. Пасля бакалаўрыята па культуралогіі я адчула патрэбу паглыбіць веды ў больш вузкай тэме, і выбар на карысць кінамастацтва быў свядомым. Гэта ступень дала магчымасць не толькі сістэматызаваць ранейшыя веды, але і паглядзець на кіно як на культурны феномен з новых перспектыў».

Далей — больш. Па словах Ганны, яна атрымала не толькі тэарэтычныя веды, але і практычныя навыкі: ад аналізу фільмаў да работы з архівамі і медыятэкамі. Нечаканасцю стала адкрытасць акадэмічнай супольнасці: выкладчыкі і аднагрупнікі былі не проста калегамі, але і партнёрамі ў мысленні. Маладая мастацтвазнаўца таксама вызначыла: «Калі б я апынулася ў магістратуры зноў, то параіла б сабе не баяцца задаваць пытанні і не адкладаць ідэі на потым. Бо гэта час, калі варта быць максімальна актыўнай, ахвочай да адкрыцця новых тэм і не баяцца выказваць уласную думку».

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

НА СЛЫХУ

# ГУЛЬНІ НА ЖАЛІ І ІМКНЕННІ ЗАРАБІЦЬ

## Як не трапіць на вуду прайдзісветаў?

Мы прывыклі здзяйсняць пакупкі ў інтэрнэт-крамах, карыстацца інтэрнэт-банкінгам, дзяліцца сваімі персанальнымі данымі пры афармленні розных дакументаў і ажыццяўленні плацяжоў. Аднак і ашуканцы актыўна абжываюцца ў лічбавай прасторы і прыдумляюць усё новыя спосабы ўзбагаціцца за кошт неасцярожных карыстальнікаў. Фальшывыя інтэрнэт-крамы з таварамі, якія вы ніколі не атрымаеце, інвестыцыі ў крыптавалюту і прыбытковыя праекты, рамантычныя махлярствы на сайтах знаёмстваў — дыяпазон падману вельмі шырокі. Спецыялісты расказалі пра самыя распаўсюджаныя схемы, па якіх дзейнічаюць зламыснікі, а таксама пра тое, хто найчасцей становіцца ахвярай такіх «разводаў».

### НЕ ПАКІДАЮЧЫ СЛЯДОЎ

Цягам апошніх гадоў ва ўсім свеце назіраўся паступовы рост кіберзлачынстваў, і наша краіна — не выключэнне. Але сёлета, з улікам прынятых мер, назіраецца зніжэнне іх колькасці. Як паведаміў **начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў Павел ГРАМУЗАЎ,** з пачатку года зарэгістравана каля 4200 махлярстваў, за аналагічны перыяд летась іх было больш за 5 тысяч.

— Сучасныя кіберзлачынствы маюць спецыфіку, якая ўскладняе іх раскрыццё па гарачых слядах. Гэта і трансгранічны характар — злачынца можа знаходзіцца ў любым пункце зямнога шара, і поўная ананімнасць, каб схаваць сваю асобу, месцазнаходжанне і мэты, — адзначыў праваахоўнік.

Самае распаўсюджанае махлярства — продаж выдуманага тавару ў псеўдаінтэрнэт-крамах, такіх злачынстваў амаль палова. Адметна, што махлярствы з выкарыстаннем усім вядомых інтэрнэт-пляцовак, якія зарэгістраваны ў Беларусі, звездзены да мінімуму. Зламыснікі цяпер дзейнічаюць у сацыяльных сетках і месенджарах, дзе ствараюць прыгожыя старонкі фальшывых крамаў. Асноўная іх мэта — атрымаць грошы ці доступ да банкаўскіх рахункаў. Яшчэ адзін распаўсюджаны спосаб — званкі пад выглядам супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, банкаў, якім пацярпелыя даюць свае плацежныя рэквізіты і доступ да рахункаў ці нават добраахвотна пералічваюць грошы. Папулярны спосаб падману — укладанне сродкаў у выгадны праект, напрыклад, у крыптавалюту. Нярэдкія выпадкі, калі ў сацсетках ствараюць фэйкавыя старонкі пасляховых беларускіх прадпрыемстваў і прапануюць грамадзянам укласціся ў акцыі і атрымаць высокі даход.

З нядаўняга часу органы МУС наладзілі супрацоўніцтва з Нацыянальным банкам, банкаўскай супольнасцю для аператыўнай блакіроўкі прасоўвання сродкаў па банкаўскіх рахунках. Цягам сутак і нават некалькіх гадзін можна спыніць любую трансакцыю, калі ёсць прыкметы махлярства. Такая блакіроўка ажыццяўляецца на тэрмін да 10 сутак па рашэнні кіраўніцтва МУС. Адметна, што ўзятая на ўзбраенне тактыка знізіла прывабнасць выкарыстання рахункаў у беларускіх банках для махляроў, заблакіравана некалькі тысяч дроп-рахункаў (іх махляры выкарыстоўваюць для абналічвання і пераводу грашовых сродкаў). Але і зламыснікі не стаяць на месцы — яны выводзяць сродкі праз рахункі замежных банкаў. Або здымаюць наяўныя ў Беларусі, затым пераводзяць іх у валюту ці крыптавалюту і перасылаюць за мяжу. Але праваахоўныя органы маюць магчымасць затрымліваць такіх людзей, часта нават на месцы злачынства — каля банкамата.

### ЯК ВЫГЛЯДАЮЦЬ МАХЛЯРЫ І ІХ АХВЯРЫ?

Як паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення Генеральнай пракуратуры Юлія ХАРЧЭЙКІНА,** летась за махлярства асуджана 816 асоб, у тым ліку з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій — 360 (44 %). Большасць асуджаных (84 %) —мужчыны. Прычым моладзь ва ўзросце ад 18 да 20 гадоў складае амаль 56 %, а вось доля непаўналетніх — усяго 6 %. Амаль палова асуджаных (48 %) не вучыліся і не працавалі. Пры гэтым 52 % зламыснікаў мелі вышэйшую ці сярэднюю спецыяльную адукацыю. Гэта не дзіўна, бо пэўныя віды такіх злачынстваў патрабуюць спецыфічных ведаў і навыкаў. 38 % з вышэйзгаданых асоб мелі нязнятую судзімасць, а 23 % здзейснілі злачынства ў групе, прычым характэрна, што яе ўдзельнікі незнаёмыя паміж сабой, знаходзіліся ў розных краінах. Такім чынам тыповы партрэт махляра выглядае так: гэта мужчына маладога ўзросту, з вялікай верагоднасцю ён не мае пастаяннага месца работы, пры гэтым з высокім узроўнем адукацыі.

Сродкам камунікацыі і атрымання інфармацыі ў такіх злачынствах выступае інтэрнэт, у прыватнасці, сацыяльныя сеткі. Інтэрнэт-пляцоўкі нярэдка выкарыстоўваюцца не толькі для продажу тавару, які адсутнічае ў рэчаіснасці, але і здзелак з арэндай кватэр. У такіх выпадках размяшчаюцца аб'явы аб здачы кватэр, атрымліваецца перадаплата і «арэндадаўца» перастае выходзіць на сувязь. У асноўным пацярпелымі з'яўляюцца студэнты. Як ні дзіўна, але па-ранейшаму людзі трапляюцца на старую хітрасць махляроў з паведамленнямі аб тым, што іх блізкія трапілі ў ДТЗ. Характэрна, што асобныя пацярпелыя неаднаразова становяцца ахвярамі такога спосабу падману.

Маюць месца такія спосабы здзяйснення злачынства з выкарыстаннем сайтаў знаёмстваў, калі падчас перапіскі падманшчык расказвае пра цяжкае матэрыяльнае становішча, захворванні сваякоў і прапануе пераводзіць грошы. Здараецца і ашуканства пад выглядам дабрачыннай дзейнасці — так званае сеткавае папрашайніцтва. Нядаўна асуджана жанчына, якая размясціла ў сацыяльных сетках аб'яву аб неабходнасці аказання дапамогі сабаку. Не маючы намеру яе аказваць, яна завалодала сродкамі 18 пацярпелых.

Сярод тых, хто павёўся на хітрыкі прайдзісветаў, яўна пераважаюць жанчыны, напрыклад, пры званках ад «сваякоў у бядзе» іх 78 %, пры «зборах» на мэты дабрачыннасці — увогуле 100 %. Характэрна, што махляры добра ведаюць сацыяльна-дэмаграфічныя асаблівасці і па поўнай эксплуатуюць іх. А вось мужчыны найбольш схільныя стаць пацярпелымі пры выкарыстанні сайтаў знаёмстваў, дзе ашуканцы часта ствараюць фальшывыя жаночыя профілі. Мужчыны дамінуюць і сярод пацярпелых ад псеўдаінвестыцый у біржы і розыгрышы. Такім чынам, пажылыя жанчыны — галоўная мішэнь псіхалагічных маніпуляцый, яны найбольш уразлівыя для эмацыйнага ціску і падману па тэлефоне. А маладыя мужчыны — група рызыкі для азартных і рамантычных схем. Адметна, што злачынцы пры выбары сваёй «мішэні» мэтанакіравана арыентуюцца на паводзінскія мадэлі патэнцыйных ахвяр.

**Алена КРАВЕЦ.**




Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «БелшинаТранс», Могилевская область, г. Бобруйск, Минское шоссе. УНП 790913853 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Полуприцеп самосвальный ПСТ-9**, 3269БЮ, 2007 г. в. Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Минское шоссе (территория ОАО «Белшина») | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 200,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 10 % от итоговой цены продажи в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 03.06.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 08.08.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.08.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | |

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит электронные торги (оператор ЭТП – **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** УНП 191224638) по продаже **транспортных средств, бывших в употреблении** (местонахождение: Минская обл., Минский р-н, аг. Ждановичи, ул. Кольцевая, 5Б), принадлежащих **Филиалу «ДЭУ № 61» РУП «Минскавтодор-Центр»** (УНП 101541258):

| Лот № | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Легковой специальный МИНИВЭН OPEL ZAFIRA, 8530 MP-5,** 2002 г. в. | **4 800,00** |
| 2 | **Легковой специальный вагон FORD TRANSIT, 0352 EE-5**, 1998 г. в. | **1 440,00** |
| С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомится на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** и оператора ЭТП **www.ipmtorgi.by** | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 27.08.2025. Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.08.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу | | |
| **Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by | | |

**ИНФОРМАЦИЯ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**
**по продаже права заключения договора аренды имущества, находящегося в республиканской собственности**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00176** по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Минское отделение Белорусской железной дороги», г. Орша, ул. Константина Заслонова, 3, тел. 80216503733.

**Организатор, Оператор ЭТП ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, тел. +375 (212) 24-63-12; +375 (29) 510-07-63; e-mail: **vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 27.08.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения с инв. № 610/С-48739 (части площади пола), (наименование – здание вокзала) – площадь пола 1,0 кв. м на 1-м этаже по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Труда, 7. Целевое использование: размещение снекового вендингового автомата, вендингового автомата для детей, вендингового автомата по продаже средств гигиены и др. бытовых мелочей, банкомата или информационного терминала. Размер коэффициента спроса на недвижимое имущество, его техническое состояние и коммерческую выгоду от сдачи в аренду – 3,0.

**Нач. цена: 37,54 руб.**

Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ (№ 32104) на сайте Минского облисполкома.

ГАРАДСКОЕ АСЯРОДДЗЕ

# МІЛЬЁН КВЕТАК НА ВУЛІЦАХ

## Як Гродна заваёўвае статус самага квітнеючага горада краіны



Апынуўшыся ў горадзе над Нёманам, немагчыма не звярнуць увагі на мноства клумбаў і кампазіцый, кашпо з дзіўнымі раслінамі, а таксама на пяціметровыя аркі з яркімі вазонамі на галоўнай пешаходнай вуліцы. Супрацоўнікі «Гродназеленбуда» задаюць трэнд азелянення, і з іх рашэннямі едуць знаёміцца з усёй Беларусі. Уласны карэспандэнт «Звязды» даведалася, як нараджаюцца кветкавыя цуды.





### ПРЫСЛУХОЎВАЮЦЦА ДА ГАРАДЖАН

Кожны год калектыў ставіць амбіцыйныя мэты, імкнецца нечым здзівіць жыхароў і гасцей горада. У рэалізацыі ідэй «Гродназеленбуд» актыўна падтрымлівае старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэй Хмель. Работнікі прадпрыемства зазначаюць, што кіраўніцтва ахвотна ідзе насустрач і нярэдка становіцца сааўтарам і аўтарам ідэй. Работа над азеляненнем — бесперапынны працэс. Яшчэ не паспеюць восенню прыбраць клумбы, як ужо ідзе абмеркаванне планаў на наступны год, расказаў **дырэктар прадпрыемства «Гродназеленбуд» Андрэй СЯМАНЧЫК.**

— Мы клапоцімся не толькі аб прыгажосці, але і аб тым, каб аблегчыць працу нашым супрацоўнікам, якія даглядаюць кампазіцыі з кветкамі, — кажа ён. — А таму актыўна ўкараняем крапельны паліў. Асабліва гэта актуальна для кветкавых кампазіцый, якія ўпрыгожваюць агароджы ў цэнтры горада і мост цераз Нёман. Дарэчы, пра мост. У мінулым годзе мы ад верху да нізу цалкам запоўнілі ўсю прастору парэнчаў вазонамі. У гэтым — зрабілі палатно хвалепадобным, таму што людзі хацелі палюбавацца не толькі кветкамі, але і Нёманам. Заўсёды прыслухоўваемся да гараджан.



### ПЯЦІМЕТРОВЫЯ АРКІ І ЛАБІРЫНТ

Папулярнае месца ў гродзенцаў і турыстаў — вуліца Савецкая, якая поўнасцю аддадзена пешаходам. Тут заўжды людна. Сёлета па прапанове мэра ўстанавілі кветкавыя аркі вышынёй 5 метраў, шырынёй — да 8-і. На прадпрыемстве прызнаюцца, што задача была няпростая. Канструкцыю распрацавалі з нуля ў «Гродназеленбудзе». Трэба было ўлічыць шмат фактараў. Па-першае, тэхніка бяспекі — праз арку павінна праехаць пажарная машына. Па-другое, трэба было дабіцца ўстойлівасці канструкцыі. Па-трэцяе, установіць яе так, каб хораша глядзелася і нікому не перашкаджала.

— Спачатку на прадпрыемства прывезлі вопытны ўзор, які мы пратэсціравалі. Вырашылі, як будзе праходзіць крапельнае паліванне. Таксама размясцілі меншыя аркі ў розных частках горада. У гэтым годзе з'явіліся на тратуарах новыя кашпо, паспрабавалі выкарыстоўваць вербы, сплеценыя ва ўзоры. Зусім свежая навінка — лавы-клумбы. Вядома, удзяляем увагу не толькі цэнтру горада, размяркоўваем кампазіцыі па ўсім Гродне. Нядаўна ў мікрараёне Фарты з'явіліся новыя кветкавыя кампазіцыі. У скверы па вуліцы Курчатава высаджаны лабірынт з 700 туй. У хуткім часе правядзём першую абрэзку. Пакуль яны яшчэ маленькія, але калі вырастуць, будзе вельмі здорава! Цяпер актыўна працуем над канцэпцыяй добраўпарадкавання горада да яго 900-годдзя, а таксама над павелічэннем колькасці сквераў, — расказаў Андрэй Сяманчык.

### СУМЕСНЫМІ НАМАГАННЯМІ

Перш чым кветкі трапяць на вуліцы горада, іх клапатліва вырошчваюць у цяпліцах «Гродназеленбуда». Сёлета адна з іх была мадэрнізавана: устаноўлены трох'ярусныя стэлажы, спецыяльнае асвятленне. Для аптымізацыі працы набылі дзве набівачных машыны.

— Вельмі хочацца, каб горад быў утульным. Прыемна бачыць, што жыхары падзяляюць нашы імкненні і на прыдамавых тэрыторыях наводзяць прыгажосць. Прадпрыемства праводзіць конкурсы на найлепшую клумбу, а таксама конкурс «Захавай пасаджанае дрэва». Апошні фінішуе 31 жніўня: мы прапануем жыхарам дасылаць фота і відэа, дзе яны ў спякотнае надвор'е паліваюць дрэвы. Пераможца атрымлівае ў падарунак ад нас кветнік на наступны год. Прыемна бачыць водгук. Выходзяць сем'ямі, нават цэлымі пад'ездамі.

Але не аднымі кветкамі займаецца «Гродназеленбуд». Увосень пачнецца пасадка новых дрэў, праводзяцца санітарныя мерапрыемствы, барацьба з паразітамі. Можна сказаць, што кожны год работы прадпрыемства — гэта год добраўпарадкавання. Андрэй Сяманчык адзначыў, што сёлета была зададзена высокая планка, а значыць — налета яна будзе яшчэ вышэйшая.

### РАБОТА СА ШІ І 3D-МАДЭЛЯВАННЕ

**Начальнік бюро ландшафтных архітэктараў Тацццяна ПАШКЕВІЧ** заўважае, што стварэнне кветкавых кампазіцый — творчы працэс. Ідэя можа нарадзіцца з адной лініі, якую ўбачыш на банеры па дарозе дадому.

— На працягу года спецыялісты запісваюць і збіраюць ідэі для новых праектаў. Затым апошнія ўвасабляюцца ў эскізы, якія ўзгадняюцца з дырэктарам і гарвыканкамам. Праекты распрацоўваем самастойна, без капіравання чужых ідэй. Вядома, у нас ёсць рэферэнсы, але мы ніколі не капіруем іх цалкам. Укараняюцца новыя тэхналогіі, такія як 3D-мадэляванне і 3D-друк, а таксама выкарыстоўваюцца нейрасеткі для стварэння ўнікальных вобразаў. Я прайшла курсы па рабоце са штучным інтэлектам, каб пашырыць творчыя магчымасці.

Догляд кветак у гарадскім асяроддзі — справа няпростая. Выбіраюцца ўстойлівыя да гарадскіх умоў, неабходна ўлічваць пагодныя фактары. Нягледзячы на ўсе намаганні, прыродныя ўмовы могуць негатыўна ўплываць на знешні выгляд раслін. У выпадку неабходнасці праводзіцца іх замена, запасныя адзінкі заўсёды ёсць.

Горад імкнецца быць самым квітнеючым і прыгожым, таму распрацоўваюцца новыя канцэпцыі і праекты. Дзякуючы гэтаму, Гродна становіцца ўсё больш прывабным для жыхароў і гасцей, тут ствараецца ўтульнае і эстэтычна прыемнае асяроддзе для жыцця і адпачынку. У многім горад над Нёманам — першапраходзец. У мінулым годзе прыязджалі з Брэста паглядзець, як упрыгожаны мост. Брэстаўчане паспелі пераняць вопыт і да восені прымяніць тэхналогію. Сёлета «Гродназеленбуд» падзяліўся ідэямі з Віцебскам. Гродзенцы адзначаюць, што яны з вялікім задавальненнем тыражуюць свае вынаходкі, бо толькі разам можна зрабіць нашу Беларусь яшчэ больш утульнай і прыгожай.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**фота аўтара.**


РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция»

**Аукцион состоится 08.09.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1:** Полуприцеп – платформа тентовая KRONE SPD 27, 2010 года выпуска, VIN: WKESD000000383660, рег. знак А 9026 В-4, допустимая полная масса – 36000 кг. Место нахождения автомобиля: Гродненская область, г. п. Новоельня, ул. Заводская, 7 |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 9 720 руб. (девять тысяч семьсот двадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1 –** 972 руб. (девятьсот семьдесят два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **04.09.2025 г. до 15.00** |

Условия проведения аукциона:
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 р. с НДС за оценку 1 единицы техники.
3. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по проведению аукциона в размере 524,51 р. с НДС за оценку 1 единицы техники

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/



ИЗМЕНЕНИЕ В ИЗВЕЩЕНИИ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «РентВиГрупп», г. Гродно, ул. Карского, 2А |

Организатор электронных торгов ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует об изменении информации в извещении по продаже имущества ООО «РентВиГрупп» (публикация в газете «Звязда» от 23.07.2025 г.):
**Начальная стоимость лота № 3 –** Салон-магазин (Торговое помещение), инв. номер 200/D-204557 – **составляет 136 500,00 бел. руб. (без НДС)**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

УНП 591039091

# УНІКАЛЬНЫЯ ЭКСПАНАТЫ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

## Чаму варта наведаць Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей і ў цэлым Мастоўскі раён

Гудзевіцкі музей — сапраўдная жамчужына не толькі Мастоўшчыны, але і ў цэлым Гродзенскай вобласці. Сваю гісторыю ён пачаў як школьны, а цяпер у яго фондах больш за 17 000 экспанатаў, аналагаў некаторых з іх няма больш нідзе ў свеце.



### АД ПАКОЯ ДА АСОБНАГА БУДЫНКА

Будынак, у якім размясціўся музей, раней быў школай, дзе сам ён займаў адзін пакой. Яго заснавальнік — настаўнік Алесь Белакоз, які сабраў звыш 14 000 экспанатаў. Пасля таго як установа адукацыі пераехала ў новы будынак, музей цалкам заняў вызваленыя плошчы. Сёння тут працуюць дзве літаратурныя залы, дзве залы народнага ткацтва і этнаграфічны аддзел, якія расказваюць аб мастацтве, культуры, народных традыцыях. У экспазіцыі нямала ўнікальных экспанатаў. Напрыклад, адзіны ў свеце глобус на беларускай мове, які быў створаны ў 1939 годзе. Вядома, гэта ўзоры падвойнага ткацтва, рэдкія літаратурныя зборнікі беларускіх пісьменнікаў. Дарэчы, Зоська Верас дапамагала Алесю Белакозу збіраць экспанаты для экспазіцыі, прысвечанай народнай медыцыне.

У двары стаіць сялянскі дом, які ў 1980 годзе прывезены з вёскі Семярэнкі. У працэсе перавозкі ўсе элементы і дэталі будынка захаваны, за выключэннем печы. Хатцы больш за 200 гадоў, унутры — арыгінальныя рэчы, якімі карысталіся сяляне. Да адкрыцця рыхтуецца новая экспазіцыя, прысвечаная гісторыі і сучаснасці Гудзевічаў. Яна падзелена на тэматычныя аддзелы. Сродкі на адкрыццё выдзелены з раённага бюджэту. Плануецца, што наведвальнікаў для азнаямлення з навінкай запросяць да канца 2025 года.

— Мы адзначаем цікавасць да музея, асабліва да экспазіцыі, прысвечанай вырабам у тэхніцы падвойнага ткацтва. У 2011 годзе гэтай тэхніцы быў прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, — расказала **дырэктар установы Таццяна ПРУДЗІЛКА**. — Супрацоўнічаем з турыстычнымі фірмамі, прымаем індывідуальных турыстаў. Нельга сказаць, што нас наведвае нейкая канкрэтная катэгорыя людзей. Бываюць і школьнікі, і дарослыя, і людзі пенсіённага ўзросту. Замежныя турысты, якія прыязджаюць пагасціць, нярэдка ўключаюць у маршрут нашу экспазіцыю.

### ЗАХАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

У 2024 годзе ў Гудзевічах адбыўся першы «Гудзевіцкі тэкстыльны фэст», які будзе праходзіць раз на два гады. Гэта мерапрыемства — працяг і новы этап у развіцці выдатнай традыцыі свят, прысвечаных рэгіянальнаму ткацтву.

Госці фестывалю могуць даведацца аб падвойным ткацтве Мастоўскага раёна, рознакаляровых узорыстых дыванах Воранаўскага раёна, белаўзорыстым ткацтве Лідшчыны, пераборным аднабаковым ткацтве Гродзенскага раёна і ваўняным ткацтве Карэліцкага раёна. Мерапрыемства рыхтуецца сумеснымі намаганнямі сектара культуры Мастоўскага райвыканкама, Мастоўскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці і Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея. Метадычную падтрымку па арганізацыі свята аказвае Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці ў межах рэалізацыі мерапрыемстваў Гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па адраджэнні ў сучасных умовах народных тэхналогій ткацтва ў Гродзенскай вобласці.

— Доўгія гады традыцыі ткацтва захоўвала і перадавала жонка заснавальніка музея Вера Ігнатаўна Белакоз, народны майстар Рэспублікі Беларусь, — расказвае Таццяна Прудзілка. — Вельмі хацелася б адрадзіць работу гуртка, які дзейнічаў у музеі шмат часу. Сама я ўмею працаваць за кроснамі. Калі была школьніцай, хадзіла на заняткі да Веры Ігнатаўны, але падвойнага ткацтва пакуль не асвоіла — гэта вельмі працаёмкі працэс. Шчыра кажучы, уявіць не магла, што калісьці ўзначалю музей. Для мяне гэта вялікі гонар.

### ШТО ЯШЧЭ ПАГЛЯДЗЕЦЬ?

Мастоўскі раён у цэлым валодае добрым турыстычным патэнцыялам. Усю падрабязную інфармацыю можна атрымаць у Мастоўскім раённым турыстычным інфармацыйным цэнтры.

— Мастоўшчына прапануе разнастайныя магчымасці для адпачынку і турызму, — адзначае **дырэктар цэнтра Вольга ХАЛЬЦОВА**. — Тут можна атрымаць асалоду ад маляўнічых краявідаў, наведаць цікавыя славутасці і актыўна правесці час на прыродзе. А пераначаваць можна ва ўтульным атэлі. Яркая славутасць раёна — падвесны мост, адкрыты сёлета пасля рэканструкцыі. У асноўным турысты з Беларусі, але прыязджаюць і з Расіі, Узбекістана, Казахстана, краін Еўропы. Ёсць унікальны музей, які расказвае пра ролю дрэва ў жыцці чалавека, з экспазіцыяй па дрэваапрацоўцы і гісторыі горада. Маецца магчымасць наведаць прадпрыемства «Мастоўдрэў» і яго музей. Вялікую цікавасць выклікае Рэспубліканскі заказнік «Ліпічанская пушча». Добра развіты рэлігійны турызм.

У турыстычным цэнтры наведвальнікі атрымліваюць падрабязныя кансультацыі, а дырэктар распрацавала якасныя буклеты па кірунках.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, фота аўтара.**

*а. г. Гудзевічы, Мастоўскі раён.*


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**1. Информация о застройщике:**

1.1. Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «АСТОМАКС», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 20.11.2002 за номером 800017077.

1.2. Место нахождения: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 73, корпус 1, помещение 3Н, кабинет 13.

1.3. Адрес отдела продаж: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 37, помещение 116.

1.4. Сведения о режиме работы (отдел продаж): с 09.00 до 20.00 в рабочие дни, с 10.00 до 18.00 в субботу, воскресенье - выходной.

1.5. В течение трех предшествующих опубликованию проектной декларации лет застройщиком построены и введены в эксплуатацию следующие объекты:

| Объекты, № по г.п.: | Фактические сроки строительства: | Объекты, № по г.п.: | Фактические сроки строительства: |
|---|---|---|---|
| **Жилые дома в квартале пр. Независимости – пр. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске:** | | | |
| 6.1 | ноябрь 2020 – ноябрь 2022 | 6.3 | ноябрь 2020 – январь 2023 |
| 6.2 | ноябрь 2020 – январь 2023 | 7.1-7.3 | декабрь 2020 – ноябрь 2024 |
| **Иные объекты недвижимости в квартале пр. Независимости – пр. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске:** | | | |
| Паркинг 6.4 | ноябрь 2020 – ноябрь 2022 | Паркинг 7.4 | декабрь 2020 – сентябрь 2024 |

**2. Информация об объекте строительства.**

2.1. Объект строительства – многоквартирный жилой дом № 9.2 по генплану в составе объекта: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения и подземными паркингами в квартале просп. Независимости – просп. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске». 9-я очередь строительства. Жилые дома 9.1-9.4 по г.п., гараж-стоянка 9.5 по г.п., объект социально-общественного назначения 9.6 по г.п. – возводится с целью обеспечения потребностей населения жилыми помещениями и реализации проекта по строительству жилых домов повышенной комфортности в составе объекта: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения и подземными паркингами в квартале просп. Независимости – просп. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске».

2.2. Возведение объекта строительства осуществляется согласно этапам, предусмотренным графиками производства строительных работ, предполагаемый срок окончания строительства (приёмки в эксплуатацию) – не позднее 16.06.2027.

2.3. Проектная документация имеет положительные заключения государственной экспертизы № 498-15/21 от 27.10.2021, № 89-15/24 от 19.03.2024, № 864-15/24 от 16.12.2024, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

Застройщик имеет право в одностороннем порядке изменять проектную документацию без дополнительных согласований с дольщиками.

Возведение объекта строительства осуществляется в квартале пр. Независимости – пр. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске на земельном участке с кадастровым номером 500000000007008756 площадью 6,7675 га, принадлежащем на праве собственности Республике Беларусь и предоставленном застройщику на праве аренды (свидетельства (удостоверения) №500/1719-9586 от 19.06.2020 и №500/706-6695 от 28.10.2021 о государственной регистрации, выданные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»).

2.4. Строительство объекта строительства предусмотрено по индивидуальному проекту.

Объект строительства – многоквартирный жилой дом, односекционный, представляет собой шестиэтажный объем, с цокольным этажом.

Конструктивная схема здания объекта строительства – монолитный рамно-связевый каркас.

В объекте строительства предусмотрены необходимые виды инженерных систем.

Предусматривается комплексное благоустройство дворовой территории объекта строительства.

Объект строительства возводится в составе квартала жилой застройки, имеющей общую территорию квартала (далее – «Квартал»).

2.5. В состав общего имущества совместного домовладения объекта строительства и Квартала, входит имущество, отнесенное законодательством к общему имуществу многоквартирного дома, а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения, объекты, связанные с объектом строительства, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией и расположенные на территории Квартала, в том числе объекты благоустройства и озеленения территории, наружные внутри- и внеквартальные инженерные сети электроснабжения, электроосвещения, теплоснабжения, водоснабжения, канализации, связи, в том числе телефонизация, диспетчеризация лифтов, ТП. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации объекта строительства. Дворовые элементы озеленения и благоустройства (детские и спортивные площадки, площадки для отдыха, проезды, тротуары), автомобильные проезды и подходы создаются для обеспечения всех многоквартирных жилых домов, входящих в Квартал.

Объекты инженерно-транспортной инфраструктуры, находящиеся за пределами наружного контура объекта строительства, входящие в состав общего имущества объекта строительства, а также объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, передаются застройщиком на безвозмездной основе эксплуатирующим их организациям как сумма затрат по их строительству в установленном законодательством порядке. Заключая договор создания объекта долевого строительства, дольщик дает тем самым согласие на безвозмездную передачу указанного имущества. Перечень передаваемых объектов и формирование суммы затрат по их строительству производится застройщиком.

В состав общего имущества совместного домовладения не входят и поступают в собственность застройщика изолированные нежилые помещения (вне зависимости от их функционального назначения, которое определяется проектной документацией), машино-места (кроме возводимых для дольщиков (покупателей) машино-мест на основании отдельного договора), сети электроснабжения к станциям зарядки электромобилей и оборудование станций зарядки электромобилей (в случае его установки, кроме установки такого оборудования для дольщиков (покупателей) на основании отдельного договора).

2.6. Между застройщиком и подрядчиками заключены договоры строительного подряда:
- с ООО «СпецГрузМастер» № 111124-1 от 11.11.2024;
- с унитарным предприятием «СУ № 21 ОАО «Минскпромстрой» № 11 от 22.01.2025.

2.7. Ознакомление застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству осуществляется путем предоставления информации по адресу отдела продаж, либо путем размещения информации на сайте kvartaldepo.by.

2.8. Объект строится на коммерческой основе, заключение договоров создания объектов долевого строительства предлагается гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, и юридическим лицам. Обязанность привлекать граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, при долевом строительстве объекта у застройщика отсутствует.

2.9. Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров – 26 единиц, которые имеют общую площадь жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) от 48,36 $м^2$ до 146,83 $м^2$.

Общая площадь объектов долевого строительства, в отношении которых будут заключаться договоры создания объектов долевого строительства, составляет 2058,50 $м^2$.

Цена одного квадратного метра общей площади жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) объектов долевого строительства составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 6700 долларам США. Цена объекта долевого строительства составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную сумме в долларах США, равной произведению цены одного квадратного метра общей площади жилого помещения и общей площади жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) соответствующего объекта долевого строительства. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не установлены договором.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от цены объекта долевого строительства (квадратного метра общей площади жилого помещения) в зависимости от общей площади, типа планировки и/или отделки (оснащения мебелью и(или) оборудованием (бытовой техникой)) объекта долевого строительства, этажа объекта долевого строительства, размера первоначального взноса и графика внесения платежей за объект долевого строительства.

Изменение цены объекта долевого строительства застройщиком в одностороннем порядке может быть произведено в случае нарушение дольщиком условий предоставления скидки, а также в иных случаях, предусмотренных договором создания объекта долевого строительства, иным соглашением сторон.

2.10. Прием заявлений о заключении договоров создания объектов долевого строительства осуществляется при заключении названных договоров через 7 дней после опубликования настоящей декларации. В случае, если договор создания объекта долевого строительства не будет заключен в течение 3 (трёх) календарных дней с момента подачи заявления о его заключении, такое заявление утрачивает силу.

Заключение договоров создания объектов долевого строительства осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263.

# ЗАБЫЦЦА ПРА МАЗАЛІ

**Многія беларусы на ўласным вопыце ўжо пераканаліся, наколькі падолагі могуць палепшыць якасць жыцця**

З якімі праблемамі часцей за ўсё звяртаюцца да гэтых спецыялістаў? Якія тэхналогіі выкарыстоўваюцца імі для дасягнення ўстойлівага выніку? На што трэба звяртаць увагу пры выбары абутку? Якую гімнастыку ступняў рэкамендуецца выконваць кожнаму для прафілактыкі непрыемнасцяў? Пра гэта пагаварылі з вопытным падолагам Аленай ЯКУБОЎСКАЙ.





***— Спачатку, Алена, давайце растлумачым, хто такі падолаг. Ці абавязкова для такіх спецыялістаў наяўнасць медыцынскай адукацыі?***

— Падолаг — спецыяліст, які займаецца апрацоўкай праблемных ступняў і пазногцяў. Далёка не ва ўсіх з іх ёсць медыцынская адукацыя. Але ўсе мы заканчваем курсы, дзе атрымліваем пэўныя медыцынскія веды. Разумеючы, што выклікае праблемы з пазногцямі і скурай ступняў, мы накіроўваем кліентаў да профільных урачоў (дэрматолагаў, артапедаў), каб яны ставілі дыягназ і прызначалі лячэнне, а самі пазбаўляем ад знешніх праяў розных паталогій на падэшвах. Напрыклад, хтосьці скардзіцца на крывавыя расколіны на ступнях. Калі я бачу прыкметы інфекцыі, рэкамендую здаць неабходныя аналізы, звярнуцца да дэрматолага і пасля кансультацыі вярнуцца да нас на апрацоўку. Пры грыбку дэрматолагі самі часта раяць пацыентам шукаць падолага — ён зачысціць частку пазногця, якая пакутуе ад мікозу.

***— З якімі праблемамі да вас звяртаюцца мужчыны і жанчыны? Хто часцей?***

— Сярод нашых кліентаў прыкладна 60 % жанчын і 40 % мужчын. Прычым многіх прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва прыводзяць да нас жонкі. Залішняя патлівасць (гіпергідроз) ступняў у мужчын часта ставарае спрыяльнае асяроддзе для грыбковай інфекцыі. З-за гэтага пазногці патаўшчаюцца, становяцца друзлымі, а на падэшве з'яўляюцца празмернае арагавенне і расколіны. У жанчын праблемы часцей звязаныя з нашэннем вузкага абутку, мадэляў на высокім абцасе, агрэсіўным педыкюрам, які траўміруе. Да сухасці, празмернага арагавення скуры, расколін на ёй, ушчыльнення і скручвання пазногцяў могуць прывесці наступствы артапедычных парушэнняў, а таксама такіх хранічных захворванняў, як варыкознае пашырэнне вен, цукровы дыябет, эндакрынныя і сардэчна-сасудзістыя паталогіі і г. д.

***— Ці ёсць сярод вашых кліентаў дзеці?***

— Так. Дзеці трапляюць звычайна з праблемай дарослых пазногцяў. Гэта тлумачыцца патлівасцю іх ступняў, няправільным абстрыганнем пазногцяў, а таксама не адпаведным па памеры абуткам.

***— Якія сучасныя методыкі і тэхналогіі прымяняюцца ў падалогіі?***

— Для карэкцыі формы пазногцяў (напрыклад, калі яны скруціліся) часта ўсталёўваюць спецыяльныя сістэмы: з дроту або пластыка. Прапануюем сіліконавыя вырабы для абароны суставаў, каб «кампенсаваць» дэфармацыю пальцаў на нагах, пазбавіць ад нязручнасцяў пры хадзьбе, для прафілактыкі мазалёў. Яшчэ выкарыстоўваем у сваёй практыцы тэйпы — эластычныя стужкі для падтрымкі, стабілізацыі і памяншэння болю пры плоскаступнёвасці, вальгуснай дэфармацыі вялікага пальца, пасля траўмаў.

***— Колькі часу патрэбна, каб пазбавіцца ад праблем на ступнях і пазногцях?***

— Звычайна мінімум паўгода. Рэдка ўдаецца ў больш кароткія тэрміны дабіцца стойкіх вынікаў. Людзям з вялікай колькасцю хранічных захворванняў нашы паслугі часам патрабуюцца пажыццёва.

***— Прывядзіце, калі ласка, прыклад таго, як дапамога падолага здольная змяніць якасць жыцця.***

— Нядаўна да мяне на прыём прывезлі жанчыну сталага веку, у якой былі вельмі патоўшчаныя і доўгія пазногці: абстрыгчы іх самастойна ў яе не атрымлівалася; гэта перашкаджала нармальна хадзіць, яна стала пустэльніцай. Родныя прызналіся: нават не здагадваліся, што ёй патрэбна дапамога. Праз некаторы час пасля педыкюру даведалася: бабулю быццам падмянілі, яе практычна нельга застаць дома.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

## ЯК АБРАЦЬ СВАЮ ЦУДОЎНУЮ ПАРУ (АБУТКУ):

► **Даўжыня абутку.** Павінна быць больш за даўжыню ступні на 5-7 мм. Пры прымерцы арыентуйцеся на самы доўгі палец. Каб даведацца, ці ваш гэта памер, устаўце ўказальны палец у вобласці задніка і праверце, ці свабодна ён туды заходзіць.

► **Шырыня**. Павінна быць з запасам. Падчас прымеркі дастаньце вусцілку і пастаўце на яе нагу. Калі ступня акажацца шырэйшай за вусцілку — мадэль вам малая.

► **Фіксацыя**. Каб нага не хадзіла ходырам па ўсім перыметры і не ўцякала наперад, спыніце выбар на мадэлях са шнуркамі ці ліпучкамі.

► **Абцас і падэшва.** У прыярытэце невялікі абцас і не надта тоўстая падэшва. Добра, калі падэшва гнецца ў месцы згібу пальцаў. Пятка павінна быць вышэйшай за пальцы для захавання правільнай біямеханікі кроку. Аптымальная вышыня абцаса 1-4 см.

► **Заднік**. Ён абавязкова павінен прысутнічаць і быць шчыльным, фармаўстойлівым.

► **Насавая частка**. Павінна трымаць форму для абароны пальцаў, не быць занадта мяккай. Вышыня насавой часткі і аб'ём абутку павінны адпавядаць ступням і не аказваць ціску на пальцы.

## ГІМНАСТЫКА ДЛЯ СТУПНЯЎ

Седзячы на крэсле (канапе), пачынайце выконваць практыкаванні — з 7-10 разоў паступова (на працягу 5 дзён) давядзіце іх да 15 разоў.

► Адцягвайце вялікі палец нагі ў бок, процілеглы астатнім пальцам. Выконвайце адначасова і для левай, і для правай нагі.

► Пальчыкі — пятка. Змяняеце становішча ступняў з пальчыкаў на пятку. Ступні левай і правай нагі рухаюцца сінхронна.

► «Кулак». Усе пальцы падцiскаеце пад ступню, потым расслабляеце, затым цягнеце пальцы ўверх.

► «Мячык». Для практыкавання спатрэбіцца спецыяльны масажны мячык з мяккімі шыпамі (можна замяніць яго тэнісным).

Ступнёй пракочваеце мячык ад пальчыкаў да пяткі — і назад. На левую і правую ступню — па 7—15 разоў.

► Падэшвамі здзяйсняеце кругавыя рухі мячыка. На кожную — 5-7 кругоў налева, 5-7 кругоў направа.

► «Уборка». Раскідайце перад сабой на падлозе 7—15 дробных прадметаў. Падымайце кожную рэч пальцамі ног і перамяшчайце. Спачатку адной нагой, затым другой.

► «Кручэнне». Пакладзіце левую нагу на правую, выканайце кручэнне ступні ў галёнкаступнёвым суставе 5—7 разоў налева, 5—7 разоў направа. Затым памяняйце ногі месцамі і выканайце практыкаванне для другой нагі.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ХАТНІМ ДОГЛЯДЗЕ СКУРЫ СТУПНЯЎ І ПАЗНОГЦЯЎ:

► Штодня 1-2 разы старанна мыць ногі з мылам, асаблівую ўвагу ўдзяляючы прамежкам паміж пальцамі.

► Пры гіпергідрозе ступняў лепш наносіць на іх спрэі, талькі, якія падсушваюць скуру. Людзям з павышанай патлівасцю трэба выкарыстоўваць сродкі, прызначаныя для апрацоўкі ўнутранай паверхні абутку.

► Раз у 2-3 тыдні неабходна падстрыгаць пазногці па прамой лініі. Каб фарміраваць квадратную форму, лепш выкарыстоўваць адмысловыя кусачкі з прамым палатном. Пасля падстрыгання можна апрацаваць паверхню пазногця пілкай.

► Штодня наносіць на пазногці пажыўныя алей з антысептычнымі кампанентамі, масіраваць зону росту.

► Штодня 1-2 разы наносіць спецыялізаваны крэм на чыстую сухую скуру ў залежнасці ад яе тыпу. Крэмы для ступняў часта ўтрымліваюць у сваім складзе супрацьзапаленчыя, супрацьгрыбковыя кампаненты, паляпшаюць кровазварот, танізуюць, загойваюць расколіны, змякчаюць, астуджаюць ці саграваюць скуру.


**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

**Организатор:** Октябрьский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

**Дата, время и место проведения аукциона:** 13 августа 2025 г. в 11.30 по адресу: Логойский район, аг. Октябрь, ул. Центральная, д.13, Октябрьский сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 72 2 35, 72 2 36; (+37544) 547-67-56. Эл. адрес: oktyabr@logoysk.gov.by

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь участка | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | **д. Росохи, ул. Дачная, 19, кадастровый номер 623285805101000059** | 0,2000 га | Энергоснабжение Грунтовая дорога | 6 000,00 | 1 200,00 | 168,00 (+публикация в газете) |

Прием заявлений и прилагаемых к ним документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) до 11.08.2025 включительно.**

Извещение о проведении повторного аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов размещено на сайтах:
1. Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by**
2. Минского городского исполнительного комитета **minsk.gov.by**
3. Логойского районного исполнительного комитета **logoysk.gov.by**

УНП 600181656



Информация о проведении аукциона **3 сентября 2025 г.** по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома **в д. Черниковщина, д. Старина** Заболотского сельсовета Смолевичского района Минской области.

***Организатор аукциона: Заболотский сельский исполнительный комитет, 222223, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1а***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Черниковщина, ул. Новая, (участок № 2, объект 85/2021) | 624882007101000441 | 0,1442 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 21 000 |
| 2 | д. Старина, ул. Лесная, (объект № 86/2021) | 624882006601000244 | 0,15 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 20 000 |

**Аукцион состоится 3 сентября 2025 г. в 15.00 в Заболотском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1а, зал заседений.**

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах – Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by**, Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by**

УНП 600023902

ВЫСТАЎКА

# СТАЛІЦА Ў ТРЭНДЗЕ

## Архітэктура любімага Мінска: усё для людзей

А ці ведаеце вы, што агульнага ў забудове Мінска і ў архітэктуры Ле Карбюзье?

Дзе мы, а дзе ён — першае, што можа прыйсці ў галаву. Швейцарац па нараджэнні, ён у мінулым стагоддзі заснаваў у Парыжы ўласнае архітэктурнае бюро і стаў знакаміты сваімі наватарскімі рашэннямі ў архітэктуры. І адным з яго прынцыпаў была функцыянальнасць забудоў, прастата і зручнасць, у тым ліку так званых «дамоў-ячэек» для людзей. О, вось гэта ўжо нам бліжэй. І сапраўды, мэтр урбаністыкі мог бы ацаніць сучасны Мінск з пункту гледжання сваіх ідэй. А насамрэч яны сталі інтэрнацыянальнымі, пайшлі па ўсім свеце і моцна паўплывалі на архітэктурную думку, у тым ліку ў Беларусі.





Пра гэта, між іншым, сведчыць адметны перасоўны праект «Ле Карбюзье: мінскае рэха», які размясціўся ў дворыку Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Да яго падрыхтоўкі далучыліся Пасольства Францыі і Пасольства Швейцарыі ў Рэспубліцы Беларусь. І невыпадкова, што злучыць гэтыя краіны з Беларуссю цяпер дапамог менавіта архітэктурны складнік. Таму што сёлета Беларускаму саюзу архітэктараў споўнілася 90 гадоў, у гонар гэтай прыгожай даты ў верасні павінен адбыцца XVI Нацыянальны фестываль архітэктуры. А выстаўка пад адкрытым небам праходзіць якраз да верасня і нібыта рыхтуе наведвальнікаў да маштабнай падзеі, якая скіраваная на тое, каб прыцягнуць увагу да прыгажосці нашай краіны і яе архітэктурнай спадчыны і адметнасці. Усё гэта, між іншым, пра любоў да Радзімы. І часам на яе трэба паглядзець нібыта збоку, на адлегласці — тады больш выразна адчуваецца лінія яе развіцця, кантэкст, у якім яна існавала і будавалася (у тым ліку літаральна). Таму падысці да традыцый айчыннай архітэктуры праз асобу Ле Карбюзье сапраўды цікава.

Найперш таму, што ён быў актыўны барацьбіт за сучаснасць і актуальнасць і часам быў гатовы ахвяраваць нейкімі адценнямі гісторыі дзеля таго, каб будаваць зручны горад. Мінск не адмаўляўся, але, на жаль, у ліхалецці страціў частку сваёй гістарычнай адметнасці. І разрасталася наша сталіца дзякуючы сучасным мікрараёнам — ну, дакладна, у духу Ле Карбюзье. І калі ведаць, што прапанаваў і пабудаваў гэты наватар у розных краінах свету, то зразумела, што сталічныя забудовы 1960—1980-х гадоў былі створаны ў духу часу і не без уплыву яго смелых ідэй. То-бок, нашы забудовы больш позняга савецкага перыяду — гэта было ў свой час не толькі зручна, але і модна, нават крута.

Да такой высновы можна прыйсці, калі пазнаёміцца з праектамі Ле Карбюзье. А пасля... Па-новаму ацаніць аблічча Мінска, дзе ёсць адметны водна-зялёны дыяметр, які спалучаецца з урбаністычнасцю, а цяпер і «жылыя адзінкі» паводле швейцарска-французскага архітэктара, дзе шмат жыхароў, для якіх прадуманы крамы і розныя паслугі. Нездарма сярод тых, дзякуючы каму паўстаў гэты праект, — Музей гісторыі горада Мінска, дзе ведаюць пра мінулае сталіцы шмат, але здолелі падкрэсліць адметнасць сучаснасці. А яна працягвае прырастаць новымі архітэктурнымі формамі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строймаш»

| Лот | Наименование | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2118 | 1. Гидростанция УС-12, инв. № 1535; 2. Пресс гидравлический 250 т 1 ст. П6334А (без гидростанции), инв. № 1500; 3. Механизм догибания коуша УС-1005, инв. № 1536; 4. Установка мерной подачи каната УС-1003, инв. № 1533; 5. Установка сборки чалок УС1001, инв. № 1532 | 48 120,00 | 4 812,00 | 2 406,00 |
| 2119 | 1. Установка для испытания строп (Строймаш), инв. № 2321; 2. Гидростанция УИС 581, инв. № 2321А | 10 560,00 | 1 056,00 | 528,00 |
| 2120 | Пресс кривошипный 1 ст. К115А, инв. № 1910 | 5 640,00 | 564,00 | 282,00 |
| 2121 | Станок для заплетки канатов УС06, инв. № 1778 | 9 000,00 | 900,00 | 450,00 |
| 2122 | Станок для заплетки канатов УС06, инв. № 1779 | 9 000,00 | 900,00 | 450,00 |
| 2123 | Пресс гидравлический 150 т ОУ-660-00-00, инв. № 2480 | 8 520,00 | 852,00 | 426,00 |
| 2125 | Компрессор 4ВУ 5/9 М2, инв. № 3889 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 2126 | Компрессор КСЕ-5М, инв. № 3849 | 4 080,00 | 408,00 | 204,00 |
| 2127 | Компрессор 4ВУ 5/9 М2, инв. № 3476 | 4 080,00 | 408,00 | 204,00 |
| 2128 | Станок специальный алмазной заточки СМ108А, инв. № 1844 | 696,00 | 69,60 | 34,80 |
| 2129 | Аквадистилятор электр. аптечный ДЭ-4-02 ЭМО, инв. № 3639 | 972,00 | 97,20 | 48,60 |
| 2130 | Станок специальный алмазной заточки СМ108А, инв. № 1683 | 540,00 | 54,00 | 27,00 |
| 2131 | Станок вертикально-расточной 2У430, инв. № 2268 | 8 400,00 | 840,00 | 420,00 |
| 2132 | Станок для нарезки трубы ССЗ-2МС, инв. № 1675 | 1 320,00 | 132,00 | 66,00 |
| 2133 | Станок обдирочно-точильный СМ-108А, инв. № 1854 | 516,00 | 51,60 | 25,80 |
| 2134 | Аппарат для плазменной резки INVERTEC PC-100, инв. № 3791 | 5 040,00 | 504,00 | 252,00 |
| 2135 | Сварочный аппарат JASIC MZ-1000, инв. № 4079 | 20 040,00 | 2 004,00 | 1 002,00 |
| 2136 | Станок вертикально-сверлильный 2А135, инв. № 2020 | 2 040,00 | 204,00 | 102,00 |
| 2137 | Ножницы кривошипные с накладными ножами Н475, инв. № 1562 | 4 320,00 | 432,00 | 216,00 |
| 2138 | Станок для калибровки УС-05, инв. № 1243 | 3 720,00 | 372,00 | 186,00 |
| 2139 | Станок для резки керамических изделий УС-14, инв. № 1399 | 384,00 | 38,40 | 19,20 |
| 2140 | Станок круглопильный ЦМЭ-3А, инв. № 2016 | 2 760,00 | 276,00 | 138,00 |
| 2141 | Стол сварщика С100.40, инв. № 1411 | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 2142 | Станок вертикально-сверлильный 2Н125, инв. № 1220 | 504,00 | 50,40 | 25,20 |
| 2143 | Станок вертикально-сверлильный 2Н118-1, инв. № 1850 | 1 200,00 | 120,00 | 60,00 |
| 2144 | Пресс гидравлический 2135-1М, инв. № 2203 | 744,00 | 74,40 | 37,20 |
| 2145 | Станок консольно-фрезерный 6Р81, инв. № 2809 | 6 960,00 | 696,00 | 348,00 |
| 2146 | Установка для переработки резины в жгут, инв. № 3703 | 6 960,00 | 696,00 | 348,00 |
| 2147 | Станок полировальный Н/М, инв. № 3674 | 540,00 | 54,00 | 27,00 |
| 2148 | Фланце-гибочный станок ВМС-92.000, инв. № 2737 | 1 320,00 | 132,00 | 66,00 |
| 2149 | Координатно-расточной 2Е440А, инв. № 1718 | 9 000,00 | 900,00 | 450,00 |
| 2150 | Полуавтомат заточной 3692, инв. № 2192 | 552,00 | 55,20 | 27,60 |
| 2151 | Полуавтомат заточной 3692, инв. № 2236 | 768,00 | 76,80 | 38,40 |
| 2152 | Стол сварщика С100.40, инв. № 1401 | 1 068,00 | 106,80 | 53,40 |
| 2153 | Стол сварщика С100.40, инв. № 1402 | 1 068,00 | 106,80 | 53,40 |
| 2155 | Станок для перемотки сварочной проволоки МО-48, инв. № 1437 | 3 840,00 | 384,00 | 192,00 |
| 2156 | Станок токарно-винторезный МК- 6056, инв. № 1370 | 8 640,00 | 864,00 | 432,00 |
| 2157 | Станок обдирочно-шлифовальный 3Б633, инв. № 2197 | 660,00 | 66,00 | 33,00 |
| 2158 | Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634, инв. № 2342 | 756,00 | 75,60 | 37,80 |
| 2159 | Прибор Б-10М (биениемер), инв. № 1292 | 708,00 | 70,80 | 35,40 |
| 2160 | Станок для намотки катушек, инв. № 2422 | 648,00 | 64,80 | 32,40 |
| 2162 | Станок горизонтально-расточной 2А622, инв. № 1826 | 36 960,00 | 3 696,00 | 1 848,00 |
| 2164 | Токарно-винторезный станок 16А20Ф3С32, инв. № 1325 | 9 480,00 | 948,00 | 474,00 |
| 2165 | Токарно-винторезный станок 16А20Ф3С39, инв. № 1327 | 9 120,00 | 912,00 | 456,00 |
| 2166 | Станок токарно-винторезный МК-6056, инв. № 1365 | 10 080,00 | 1 008,00 | 504,00 |
| 2167 | Станок токарно-винторезный МК-6056, инв. № 1368 | 10 080,00 | 1 008,00 | 504,00 |
| 2168 | Станок токарно-винторезный МК-6056, инв. № 1369 | 10 080,00 | 1 008,00 | 504,00 |
| 2170 | Станок токарно-револьверный 1Г340П, инв. № 1219 | 5 280,00 | 528,00 | 264,00 |
| 2171 | Станок поперечно-строгальный 7М37, инв. № 2049 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 2172 | Станок зубодолбежный 5Б150, инв. № 2165 | 39 360,00 | 3 936,00 | 1 968,00 |
| 2173 | Станок шлицефрезерный 5350, инв. № 2241 | 13 080,00 | 1 308,00 | 654,00 |
| 2174 | Полуавтомат зубофрезерный 53А30П, инв. № 1809 | 21 720,00 | 2 172,00 | 1 086,00 |
| 2175 | Полуавтомат зубофрезерный 5А326, инв. № 1371 | 55 560,00 | 5 556,00 | 2 778,00 |
| 2176 | Полуавтомат зубофрезерный БК32А, инв. № 2320 | 7 920,00 | 792,00 | 396,00 |
| 2177 | Станок круглошлифовальный (полуавтомат) 3У131, инв. № 1555 | 21 360,00 | 2 136,00 | 1 068,00 |
| 2178 | Станок плоскошлифовальный 3Б722, инв. № 2164 | 7 080,00 | 708,00 | 354,00 |
| 2179 | Станок внутришлифовальный (полуавтомат) 3М227В, инв. № 1251 | 15 000,00 | 1 500,00 | 750,00 |

В отношении лотов проводятся первые торги

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Рыбалко, 26

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **29 августа 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 29 июля 2025 года до 16.00 27 августа 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту ____, ОАО «Строймаш», проводимых 29.08.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр.лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 2175 – 6 %, по лотам №№ 2118, 2119, 2135, 2162, 2166–2168, 2172–2174, 2177, 2179 – 7 %, по лотам №№ 2120–2123, 2131, 2134, 2145, 2146, 2149, 2156, 2164, 2165, 2170, 2176, 2178 – 8 %, по лотам №№ 2125–2127, 2132, 2136–2138, 2140, 2143, 2148, 2152, 2153, 2155, 2171 – 9 %, по лотам №№ 2128–2130, 2133, 2139, 2141, 2142, 2144, 2147, 2150, 2151, 2157–2160 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/. Дополнительная информация по предмету торгов – по тел. **+375293082897, Анаида.**
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375293808329 Николай Николаевич (пн – пт с 9.00 до 15.30).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании действующего законодательства Республики Беларусь

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Строймаш» в лице управляющей компании ООО «Партнёр-Консультант» (220033, г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26) +375 (44) 505-16-54 (Николай Маркович), info@stroymash.by** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» (220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127) ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

СПОРТ-ТАЙМ

# МЕДАЛІ І ДОСВЕД

## Падводзім вынікі галоўных стартаў для моладзі

13 узнагарод, бясцэнны досвед і вялікія перспектывы прывезлі дадому маладыя беларускія спартсмены з Еўрапейскага алімпійскага юнацкага фестывалю. Некалькі дзён у сталіцы Паўночнай Македоніі горадзе Скоп'е больш за паўтары тысячы маладых атлетаў з 49 краін змагаліся за медалі ў розных відах спорту. У беларусаў пяць залатых і па чатыры сярэбраныя і бронзавыя медалі.




«Хлопцы і дзяўчаты паказалі годны ўзровень падрыхтоўкі і добрыя вынікі. Мы чакалі медалёў, хай і заўсёды хочацца больш, але ў цэлым усе задаволеныя выступленнем. Нашы спартсмены ўжо ўдзельнічалі ў гульнях «Дзеці Азіі» і «Дзеці Прымор'я», так што яны былі гатовыя да той канкурэнцыі, якую ўбачылі. Яны вялікія малайцы», — адзначыў шэф місіі беларускай дэлегацыі ў Скоп'е Васіль Юрчык.

Двухразовым чэмпіёнам фестывалю стаў плывец Максім Малышка. Ён быў найлепшым на дыстанцыі 100 метраў брасам. А пасля замацаваў поспех на дыстанцыі 200 метраў брасам. «Быў упэўнены, што займу першае месца. Лёгкі мандраж перад вырашальным заплывам прысутнічаў. У папярэдніх не выкладваўся на поўную моц, а ў паўфінале паказаў не той вынік, які хацеў, хоць і выйшаў з лепшым часам. У фінале ўжо выкладваўся па максімуме. Гэта мае першыя міжнародныя спаборніцтвы. Тут моцная канкурэнцыя, мне падабаецца», — падзяліўся ўражаннямі Максім Малышка.

Анастасія Васіленка на каронным дыстанцыі 50 метраў вольным стылем заняла другое месца. Мікіта Лях стаў сярэбраным прызёрам на дыстанцыі 100 метраў вольным стылем. А пасля замацаваў свой поспех перамогай на дыстанцыі 50 метраў кролем. Як потым прызнаўся сам спартсмен, менавіта гэта было яго галоўнай мэтай на турніры. Дасягнуў яе вельмі прыгожа, з новым юніёрскім рэкордам краіны — 22,73 секунды.

Стралкі Дар'я Чупрыс і Арсеній Ліванцоў занялі першае месца ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі ў дуэце. Аліна Несцяровіч была самай меткай у спаборніцтвах з пнеўматычнага пісталета ў дысцыпліне «Сола» і заваявала залаты медаль.

Медалі са Скоп'е прывезлі і нашы таэквандысты. У катэгорыі да 63 кг сярэбраны медаль заваяваў Уладзімір Шрамук. Бронзавымі прызёрамі ЕАЮФ сталі Марыя Струнец (да 49 кг) і Мікіта Белавы (да 48 кг).

Нагода для радасці — і вынікі весляроў. На юніёрскім чэмпіянце свету ў Партугаліі нашы спартсмены заваявалі чатыры залатыя, пяць сярэбраных і адзін бронзавы медаль. Марыя Папічыч і Паліна Собаль — чэмпіёнкі на дыстанцыі 500 метраў у каноэ-двойцы U18, Юлія Трушкіна і Іна Нядзелькіна — пераможцы ў каноэ-двойцы на дыстанцыі 200 метраў U23. У спаборніцтвах каноэ-двоек на дыстанцыі 500 метраў першымі фінішавалі Ягор Аўчыннікаў і Вадзім Лычоў U18. Кацярына Семянцова, Іна Нядзелькіна, Ева Данільчук і Ганна Наляцько — найлепшыя ў чацвёрцы на дыстанцыі 500 метраў U23. Экіпаж каноэ-чацвёркі ў складзе Ягора Аўчыннікава, Івана Архіпенкі, Аляксея Маглюя і Канстанціна Рогава на дыстанцыі 500 метраў заняў другое месца. Марыя Папічыч на паўсотні стала другой у адзіночцы.

У заездзе байдарак-чацвёрак на дыстанцыі 500 метраў сярод юніёраў Аляксей Пажывілка, Эміль Абалмасаў, Ігар Якшын, Георгій Варажун сталі сярэбранымі прызёрамі. Ігар Якшын заняў другое месца ў заездзе адзіночак на дыстанцыі 1000 метраў сярод юніёраў. Дзяніс Ярмоленка стаў сярэбраным прызёрам у заездзе адзіночак на 500 метрах. На гэтай жа дыстанцыі Эміль Абалмасаў і Георгій Варажун былі другімі ў гонцы двоек.

У каноэ (500 м, юніёры) Ягор Аўчыннікаў, Іван Архіпенка, Аляксей Маглюй, Канстанцін Рогаў сталі бронзавымі прызёрамі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота НАК Беларусі.**

НАДВОР'Е

# ПАРАСОНЫ ЛЕПШ ТРЫМАЦЬ ПАД РУКОЙ

## Ліпень фінішуе дажджамі, часам моцнымі

На апошнім працоўным тыдні ліпеня франтальныя раздзелы не пакінуць у спакоі нашу краіну. «Таму характар надвор'я будзе неспакойным. Часам прагназуюцца дажджы, пры актыўным развіцці атмасферных працэсаў ападкі будуць дасягаць крытэрыяў моцных, суправаджацца навальніцамі і моцным парывістым ветрам. Таму парасоны лепш трымаць пад рукой», — параілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя, а таксама навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў умераны, пры навальніцах парывісты, у асобных раёнах шквалістае ўзмацненне.

Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе ад 11 °C да 21 °C па паўднёвым усходзе. Днём будзе ад 20 °C па паўднёвым захадзе да 32 °C па ўсходзе.

У сераду надвор'е будзе вызначаць цыклон, цэнтр якога перамесціцца з тэрыторыі Украіны на Беларусь. Чакаецца воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі — дажджы, у заходніх і цэнтральных раёнах — моцныя дажджы. Месцамі — навальніцы, днём магчымы град. Вецер пераменных напрамкаў — умераны, пры навальніцах — парывісты, месцамі — да моцнага. Тэмпература паветра ноччу — 13-20 °C, днём — ад 15 °C па захадзе да 29 °C па поўначы.

У чацвер надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, цэнтр якога перамесціцца з Беларусі на Балтыйскае мора. Захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. На большай частцы тэрыторыі — кароткачасовыя дажджы, месцамі — навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў умераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы — ад 11 °C па паўднёвым захадзе да 19 °C па паўночным усходзе. Днём месцамі чакаецца 18-23 °C, а па поўначы ў многіх раёнах — 24-27 °C.

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК 754 мм рт.сл. | +19..+22°C | +19..+22°C |
| ВІЦЕБСК 756 мм рт.сл. | +19..+20°C | +28..+29°C |
| МАГІЛЁЎ 755 мм рт.сл. | +20..+21°C | +24..+26°C |
| ГОМЕЛЬ 755 мм рт.сл. | +21..+23°C | +21..+24°C |
| ГРОДНА 754 мм рт.сл. | +16..+18°C | +15..+16°C |
| БРЭСТ 756 мм рт.сл. | +16..+18°C | +15..+17°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Маладзік 24.07.–31.07. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз. 01 гадз. 04 гадз. 07 гадз. 10 гадз. 13 гадз. 16 гадз. 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| МАСКВА | +28..+29°C |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +30..+31°C |



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**29 ЛІПЕНЯ** Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1939** год — Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову, згодна з якой назва сталіцы Менск мянялася на Мінск.

**1965** год — у Мінску адкрыўся планетарый.

У свеце

**1900** год — нарадзіўся Міхаіл Клаўдзіевіч Ціханраваў, рускі вучоны і канструктар у галіне ракетабудавання і касманаўтыкі, Герой Сацыялістычнай Працы (1961), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Расіі (1970). Кіраваў распрацоўкай першай савецкай ракеты з вадкасным ракетным рухавіком (1933). Удзельнік стварэння першых савецкіх ШСЗ, касмічных караблёў, аўтаматычных міжпланетных станцый і іншага. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1957).

**1915** год — нарадзіўся Павел Пятровіч Кадачнікаў, савецкі акцёр і рэжысёр, народны артыст СССР (1979). Здымаўся ў фільмах «Подзвіг разведчыка», «Аповесць аб сапраўдным чалавеку», «Сібірыяда» і іншых. Паставіў фільмы «Снягурачка», «Я цябе ніколі не забуду». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (тройчы — 1948, 1949, 1951).

**1963** год — адбыўся першы палёт Ту-134, спраектаванага пад кіраўніцтвам Андрэя Тупалева. Рэактыўны самалёт Ту-134 — адзін з найбольш удалых праектаў у галіне пасажырскага самалётабудавання. Ён увайшоў у гісторыю грамадзянскай авіяцыі як самы масавы і папулярны савецкі авіялайнер.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь КАВАЛЕНКУ Яўгену Іосіфавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў чацвёртага склікання ФІЛІМОНЧЫК Таццяны Сцяпанаўны і выказваюць глыбокія спачуванні яе родным і блізкім.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 779 Індэкс 63850. Зак. № 1524.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 ліпеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12